ЗАХАВАЦЬ БЕЛАВЕЖСКУЮ ПУШЧУ 4

ВЕРНЫЯ СЛОВЫ І ВЕРНЫЯ СЭНСЫ 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

20 ВЕРАСНЯ 2023 г.
СЕРАДА
№ 182 (30062)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ЦЫТАТА ДНЯ

Сяргей БАРТАШ, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:

«Сёлета мы ідзём з апярэджаннем па ўсіх кірунках правядзення восеньскіх палявых работ. Азімыя збожжавыя плануем пасеяць да канца месяца. Што да кукурузы, то тэмпы ўборкі на сілас вышэйшыя за леташнія. Ураджай значна вышэйшы за мінулы год. Уборку кукурузы на зерне мы таксама пачалі раней леташняга, плануем завяршыць яе да 15 кастрычніка».

КАРАТКА

- У Беларусі ў студзені — жніўні ўзвялі 23,2 тыс. кватэр.
- **Андрэй Картун: галоўнымі драйверамі паскарэння ВУП сталі прамысловасць, будаўніцтва і гандаль.**
- БУТБ спросціць закупку тавараў-аналагаў для прадпрыемстваў АПК.
- **БНТУ падпісаў пагадненне аб супрацоўніцтве з двума кубінскімі ўніверсітэтамі.**
- Краснадарскі край зацікавіла камунальная і сельгастэхніка «АМКАДОРа».
- **Грузаабарот паміж Беларуссю і Расіяй за сем месяцаў вырас на 23 працэнты ў параўнанні з мінулым годам.**
- «Расатам» паставіў першую партыю генератараў для медустаноў Беларусі.

Звонкая дынастыя

Фота БелТА.

Сям'я Скарынавых з гарадскога пасёлка Шуміліна — музычная дынастыя. Віктар і Алена Скарынавы многія гады выкладаюць у Шумілінскай школе мастацтваў. Іх выхаванцы становяцца лаўрэатамі міжнародных фестываляў і конкурсаў. Творчыя памкненні бацькоў з поспехам працягваюць дзеці: дочкі Вольга, Марыя і сын Васіль. Старэйшая дачка Вольга — не толькі таленавіты педагог па класе цымбалаў, але і цудоўны музыкант. У Марыі таксама нямала перамог на прафесійнай ніве, як у якасці цымбалісткі, так і піяністкі. Працягвае займацца музыкай і сын Васіль, у якога музычныя перамогі яшчэ наперадзе.

ПАРАДАК ДНЯ — ВЫПРАЦОЎКА СЯРЭДНЕ- І ДОЎГАТЭРМІНОВАЙ СТРАТЭГІІ

З выступлення Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ на адкрыцці адзінаццатай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання

Гэтае скліканне прыпадае на асаблівы перыяд сучаснай гісторыі не толькі для Рэспублікі Беларусь, беларускай дзяржаўнасці, але і ў цэлым гісторыі развіцця чалавечай цывілізацыі, гісторыі свету.

І тое, аб чым яшчэ некалькі гадоў таму ўсіх дальнабачна папярэджваў наш Прэзідэнт, глыбокапаважаны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, сёння мы назіраем на свае вочы.

Геапалітычны падзел свету. Маштабны, сістэмны крызіс, сімптомы якога відавочныя ўсім нам. І не толькі ў ваенна-палітычнай, але і ў эканамічнай, гуманітарнай сферах.

Нормы і прынцыпы міжнароднага права сталі падмяняцца інструментамі палітычнага і эканамічнага ціску, ваеннага і інфармацыйнага шантажу, дыскрымінацыяй па моўнай, рэлігійнай, нацыянальнай і іншых прыкметах. Месца дыпламатыі ўсё больш займае палітыка санкцый.

У цэлым сітуацыя і перспектывы яе развіцця — у высокай ступені нявызначанасці. Наступствы — цяжка прагназавальныя. Але бясспрэчна адно: яшчэ ніколі чалавецтва не было так блізка да трэцяй сусветнай вайны. І калі дойдзе да прымянення ядзернай зброі, пераможцаў у гэтай вайне не будзе. Прайграюць усе.

СТАР. 3

БЫЦЬ У ЦЭНТРЫ ПАДЗЕЙ ПОБАЧ СА СВАІМІ ВЫБАРШЧЫКАМІ

З выступлення Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь АНДРЭЙЧАНКІ У. П. на адкрыцці дзясятай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання

Не выклікае сумнення, што ў найбліжэйшай перспектыве нам не дадуць жыць спакойна, будуць і далей выпрабоўваць на трывалась. Чарговай нагодай для гэтага стане выбарчая кампанія, якая завершыць канстытуцыйную рэформу. Яна стартуе зусім хутка і шмат у чым вызначае тыя задачы, якія трэба будзе вырашыць дэпутацкаму корпусу ў ходзе сесіі.

Найперш з іх застаецца прывядзенне дзеючага заканадаўства ў адпаведнасць з палажэннямі Асноўнага Закона. Значны аб'ём заканадаўчай работы — каля 90 працэнтаў — ужо рэалізаваны. Кіраўнік дзяржавы даручыў дэпутатам ця перашняга склікання прыняць усе законапраекты канстытуцыйнага блока, і гэтае патрабаванне павінна няўхільна выконвацца.

Цэнтральнае месца на парадку дня сесіі адводзіцца пытанням нацыянальнай бяспекі. Падтрыманне грамадзянскага міру, выкананне сацыяльных абавязацельстваў дзяржавы і дабрабыт грамадзян шмат у чым залежаць ад тэмпаў эканамічнага росту.

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2023 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«МЫ РАЗГЛЯДАЕМ КУБАНЬ ЯК КЛЮЧАВЫ РЭГІЁН, ДЗЕ МЫ ПАВІННЫ «ЗАЗЯМЛІЦЦА»

Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з губернатарам Краснадарскага краю Веніямінам Кандрацьевым. Дэлегацыя рэгіёна гэтымі днямі знаходзіцца з рабочым візітам у нашай краіне. Кубань — даўні і перспектыўны партнёр Беларусі. У мінулым годзе таваарабарот склаў 555 мільёнаў долараў. У студзені — ліпені 2023 года таваараабарот склаў ужо 337,4 мільёна долараў. У мінулым годзе Веніямін Кандрацьеў наведваў Беларусь. Той візіт даў старт прапрацоўцы шэрагу ініцыятыў у галіне сельскагаспадарчага машынабудавання.

Фота Бел ТА.

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, беларускі бок цяпер актыўна супрацоўнічае з рэгіёнамі Расіі. «Апошнім часам мы дашлі да таго, што ў Расіі нам трэба вызначацца па ключавых рэгіёнах, адкуль трэба працаваць на суседнія рэгіёны і гэтак далей. Мы разглядаем Кубань як ключавы рэгіён, дзе мы павінны «зазямліцца», — сказаў Прэзідэнт. Па яго словах, сёння, пасля сыходу замежных кампаній, у Расіі і Беларусі ёсць магчымасць развівацца на ўласнай тэхналагічнай базе. Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, на шчасце, у Беларусі такая база захавалася і развіваецца.

«Галоўнае ў тым, што Беларусь сёння запатрабавана ў Расіі як ніколі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, Беларусь сёння можа вырабляць многае: ад трактараў да мікраэлектронікі. Сёння вельмі сур'ёзна разглядаецца пытанне аб стварэнні і вытворчасці тавараў мікраэлектроннай прамысловасці, без якіх немагчыма ўявіць сабе развіццё. «Таму рэспубліка мае каласальныя магчымасці ў плане тэхналогій», — падсумаваў беларускі лідар.

Па словах беларускага лідара, СВА ва Украіне падштурхнула да таго, каб і абаронным комплексам нашых краін сур'ёзна развівацца. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, апошнія перагаворы прэзідэнтаў Беларусі і Расіі былі прысвечаны абароне і бяспецы. «Мы ведаем, што Украіна — гэта толькі пачатак, кветачкі. Ягадкі могуць нас чакаць наперадзе, калі мы не мабілізуемся і не пакажам ім, што мала не здасца. Нас найбольш насцярожвае Польшча, а за Польшчай стаіць Амерыка. Яны вырашылі разбурыць усё, што тут ёсць, ну а найперш — Еўрапейскі саюз. А галоўны пункт апоры — гэта Польшча. У 2020 годзе нас хацелі далучыць туды, каб мы тут раздзяляльнай лініяй былі паміж Усходам і Захадам. Не атрымалася. Таму мы цяпер удзяляем вялікую ўвагу абаронцы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Супрацоўніцтва з вамі можа ісці ва ўсіх кірунках, вы гэта цудоўна ведаеце. Гэта і сельская гаспадарка, і машынабудаванне, гэта і тыя ж ліфты для новых будынкаў і асабліва для старых савецкіх будынкаў, дзе ліфты ўжо праслужылі шмат дзесяцігоддзяў і іх трэба мяняць... Наша палітыка — не кідацца на нешта вялікае і новае, таму што гэта вялікія грошы і «дагонім перагонім» — гэта не наш прынцып. А развіваць тое, што мы ўмеем рабіць», — сказаў Прэзідэнт, дадаўшы, што «калі Кубані нешта трэба і вы ўбачыце тут — мы абавязкова зробім».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў Краснадарскім краі актыўна пераходзяць на экалагічную пасажырскую тэхніку. Паводле яго слоў, беларускія спецыялісты ўсё гэта могуць зрабіць і на газаматорным паліве і іншае. Але ў беларускага лідара ёсць адна просьба — каб усё гэта абслугоўвалі беларускія спецыялісты.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што партнёры з Краснадарскага краю могуць па любых пытаннях разлічваць на беларусаў. Беларусь разглядае Кубань на поўдні як адзін з ключавых, развітых рэгіёнаў, адкуль можна працаваць з іншымі абласцямі Расіі, стварыўшы пэўны хаб. Беларускія кадры гатовы дапамагчы і ў будаўніцтве, асабліва ў сацыяльнай сферы, якая цяпер сур'ёзна развіваецца ў Расіі ў цэлым і ў Краснадарскім краі ў прыватнасці. Прэзідэнт запэўніў, што ўсе дамоўленасці беларускім бокам будуць выкананы.

У адказ Веніямін Кандрацьеў падкрэсліў, што на сустрэчы з беларускім лідарам абмяркоўваецца не толькі гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва, але і жыццё ў рамках сённяшніх выклікаў і цяжкасцяў. «Калі мы сутыкнуліся з цяжкасцямі і выклікамі, я аналізаваў, дзе знайсці таго партнёра, які дазволіць нам захаваць нашу высокатэхналагічную сельскую гаспадарку, захаваць агрmaпрамысловы комплекс высокатэхналагічным. Гэта было важна, паколькі мы павінны былі заставацца і гарантам харчовай бяспекі, і жытніцай краіны. І лепшага партнёра, чым Беларусь, я не знайшоў», — адзначыў Веньямін Кандрацьеў. Актыўнае супрацоўніцтва Беларусі і Краснадарскага краю пачалося паўтара года таму, за гэты час кіраўнік рэгіёна неаднаразова сустракаўся з прэм'ер-міністрам Беларусі Раманам Галоўчанкам. «Юрыдычна адносіны Беларусі і Краснадарскага краю развіваюцца 20 гадоў. Але па-сапраўднаму на новы ўзровень менавіта гандлёва-эканамічных адносін мы выйшлі толькі цяпер. Вынік у наяўнасці. Таваараабарот мінулага года павялічыўся на 52 працэнты ў параўнанні з 2021 годам і сёння перавышае 40 мільярдаў расійскіх рублёў. І сёлета ён расце, і гэта для нас вельмі важна», — адзначыў Веніямін Кандрацьеў.

Валерыя СЦЯЦКО.

У тэму

У размове з журналістамі губернатар Краснадарскага краю расказаў, што супрацоўніцтва яго рэгіёна з Беларуссю будзе пашырацца. Прычым не толькі ў прамысловай кааперацыі. «Аграпрамысловы комплекс краю — гэта высокатэхналагічны комплекс, і дзякуючы супрацоўніцтву з Мінскім трактарным заводам, «Гомсельмашам», МАЗам ён застанецца высокатэхналагічным», — сказаў Веніямін Кандрацьеў. Ён таксама адзначыў вялікі сумесны патэнцыял прамысловай кааперацыі. Губернатар звярнуў увагу, што ў гэтым выпадку размова ідзе не аб планах, а аб рэалізацыі канкрэтных мер. Паводле яго слоў, супрацоўніцтва будзе пашырацца ў прамысловай сферы. Беларускія будаўнікі пачалі праектаванне сацыяльных аб'ектаў у Краснадары. Веніямін Кандрацьеў бачыць вялікі патэнцыял супрацоўніцтва ў вытворчасці насення, паколькі Краснадарскі край — аграрны рэгіён і селекцыя насення стаіць у прыярытэце. «Культурнае, турыстычнае супрацоўніцтва таксама вельмі важнае для гарманічных адносін паміж Краснадарскім краем і Беларуссю. Адносіны паміж Беларуссю і Краснадарскім краем заснаваны ў першую чаргу на сяброўстве і ўзаемапавазе, агульнай гісторыі. І сёння мы павінны гэта захаваць і прымножыць», — заявіў кіраўнік рэгіёна.

Парламенцкі дзённік

СТВАРЭННЕ ЎМОЎ ДЛЯ ПРАФЕСІЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ І КАМФОРТНАГА ЖЫЦЦЯ

Падчас першага пасяджэння дзясятай сесіі Палаты прадстаўнікоў сёмага склікання разгледжана 11 законапраектаў

У найбліжэйшы час змяненні закрануць заканадаўства па пытаннях ліцэнзавання, кіравання жыллёвым фондам і яго эксплуатацыі. Па новых правілах будуць ажыццяўляцца дзяржаўныя закупкі тавараў, работ і паслуг. Новаўвядзенні чакаюць законы «Аб дарожным руху», «Аб адзінай дзяржаўнай сістэме рэгістрацыі і ўліку правапарушэнняў», «Аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці», «Аб каранціне і абароне раслін». Шэраг навацый прадугледжаны і ў сферы аховы здароўя.

Заканатворцы працуюць і з мэтай умацавання і гарантавання нацыянальнай бяспекі. У прыватнасці, падчас першага пасяджэння дзясятай сесіі дэпутаты прагаласавалі за спыненне дзеяння Дагавора аб звычайных узброеных сілах у Еўропе ў адносінах Рэспублікі Польшча і Чэшскай Рэспублікі. Страціла сваю сілу і Пагадненне паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай аб рэгуляванні працэсу перасялення і абароне правоў перасяленцаў і членаў іх сем'яў. Цяпер усе пытанні перасяленцаў урэгуляваны нормамі нацыянальнага заканадаўства і іншымі міжнароднымі дагаворамі.

ЯКІЯ ЗМЕНЫ ЧАКАЮЦЬ ЭКАНАМІЧНЫ БЛОК?

Традыцыйна на кожнай сесіі парламентарыі ўдзяляюць вялікую ўвагу законапраектам эканамічнага блока. Дзясятая сесія не стане выключэннем. «Дэпутацкі корпус класічна разгледзіць пакет бюджэтных дакументаў на 2024 год, — анансавала **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы Святлана ГОРВАЛЬ**. — Ужо вядзецца карпатлівая, дасканалая работа профільнай камісіі па важных законапраектах для нашай краіны. У прыватнасці, у Палату прадстаўнікоў паступіў законапраект «Аб страхавой дзейнасці», які мяняе падыходы да страхавога рынку Беларусі. З'яўляюцца сучасны, канкурэнтаздольны рынак страхавых паслуг, дадатковыя гарантыі абароны грамадзян і арганізацый, якія ўдзельнічаюць на рынку страхавых паслуг».

Акрамя таго, у другім чытанні плануецца прыняць праект закона «Аб змяненні законаў па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці», які нарабіў нямала шуму ў грамадстве. Як расказала Святлана Горваль, дэпутацкі корпус правёў маштабную, сур'ёзную работу па тлумачэнні новаўвядзенняў, зборы прапаноў і заўваг: былі праведзены грамадскія абмеркаванні, на тэрыторыі ўсіх абласцей краіны адбыліся дыялогавыя пляцоўкі. Законапраект накіраваны на ўпарадкаванне ўсіх нюансаў прадпрымальніцкай дзейнасці, спрашчэнне ўсіх адміністрацыйных працэдур, з якімі цяпер сутыкаюцца суб'екты малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

Чакаецца, што ад урада паступіць праект закона, які датычыцца змянення заканадаўства аб інвестыцыях.

НАВАЦЫІ ДЛЯ КІРОЎЦАЎ І ЎЛАСНІКАЎ ЖЫЛЛЯ

У першым чытанні парламентарыі прынялі законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дарожным руху». Дакумент накіраваны на прывядзенне норм Закона «Аб дарожным руху» ў адпаведнасць з нормамі шэрагу іншых заканадаўчых актаў, прынятых у апошні час, а таксама на ўдасканаленне заканадаўства ў гэтай сферы з улікам практыкі прымянення.

Як падкрэсліў **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Дзяніс КАРАСЬ**, глабальных рэгламентацый у сферы дарожнага руху не прадбачыцца. Законапраект перш за ўсё накіраваны на ліквідацыю канкрэтных прававых прабелаў. «Што датычыцца грамадзян, дапаўняецца артыкул, у якім прапісана, у якіх выпадках вадзіцельскае пасведчанне лічыцца несапраўдным, — удакладніў дэпутат. — Канкрэтызавана, што ў выпадку навучання кіроўцы механічнага транспартнага сродку кваліфікацыйны экзамен можна здаваць як на механічнай, так і на аўтаматычнай трансмісіі».

У першым чытанні адобраны законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях кіравання жыллёвым фондам і яго эксплуатацыі». У прыватнасці, прадугледжана ўзмацненне адказнасці старшыняў праўленняў арганізацый уласнікаў за невыкананне заканадаўства па кіраванні агульнай маёмасцю сумеснага домаўладання. Па словах **старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Віктара НІКАЛАЙКІНА**, пры неэфектыўнай рабоце старшыняў таварыстваў уласнікаў пэўнымі паўнамоцтвамі надзяляюцца мясцовыя органы ўлады. «Напрыклад, прызначаць арганізацыі па аказанні асноўных і дадатковых паслуг, — удакладніў дэпутат. — У выпадку неэфектыўнай работы, парушэння заканадаўства або нядобрасумленнага выканання сваіх абавязкаў старшынёй таварыства мясцовыя органы ўлады будуць мець права выйсці з прапановай па пазбаўленні пасведчання прафесійнай атэстацыі гэтых страшыняў. Аўтаматычна будзе разглядацца пытанне аб спыненні з імі працоўных адносін».

УВАГА — ЗДАРОЎЮ І ТЫМ, ХТО НАРАДЖАЕ

У другім чытанні прыняты змяненні ў заканадаўства па пытаннях аховы здароўя. «Уносяцца змяненні ў два законы: «Аб аховe здароўя» і «Аб дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартах», — паведаміла **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Людміла МАКАРЫНА-КІБАК**. — Прадугледжаны тры асноўныя навацыі: падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі, якасць вырабаў медыцынскага прызначэння і пытанне акрэдытацыі медыцынскіх устаноў, якія падзеляцца на базавы і нацыянальны ўзроўні».

Кажучы аб планах на бягучую сесію, дэпутат адзначыла, што ў найбліжэйшы час у профільную камісію паступіць Кодэкс аб шлюбе і сям'і, у які плануецца ўнесці змяненні. «Да канца года чакаем паступлення законапраекта «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей», — анансавала парламентарый. — Мы будзем паляпшаць умовы для жыцця мам, якія выхоўваюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў. Мы ім дадзім магчымасць працаваць без памяншэння дапамогі. Будзем казаць аб павелічэнні дародавай і паслядародавай дапамогі для маладых спецыялістаў, студэнтаў і навучэнцаў».

Вераніка КАНЮТА.

ПАРАДАК ДНЯ — ВЫПРАЦОЎКА СЯРЭДНЕ- І ДОЎГАТЭРМІНОВАЙ СТРАТЭГІІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Як справядліва падкрэсліў кіраўнік дзяржавы ў сваім выступленні на патрыятычным форуме «Мы — беларусы!», «нам не трэба расказваць, як важна жыць у міры і згодзе, быць адзінай нацыяй. Жыццё навучыла нас».

Парадак дня Савета Рэспублікі — не рэакцыя і рэфлексія на тое, што адбываецца, а выпрацоўка сярэдне- і доўгатэрміновай стратэгіі. Прычым нашы мірныя і стваральныя ініцыятывы не абмяжоўваюцца ўнутрыдзяржаўным жыццём, а датычацца будучыні рэгіёна, кантынента і глабальнага развіцця.

У тых геапалітычных рэаліях, у якіх ажыццяўляецца дзейнасць Нацыянальнага сходу сёмага склікання, ключавая мэта заканатворчасці — замацаваць дасягнутую якасць суверэнітэту беларускай дзяржавы. Парламентарыі працягнулі работу па ўдасканаленні нацыянальнай прававой сістэмы, умацаванні законнасці і правапарадку, захаванні сацыяльнай стабільнасці і грамадзянскай згоды.

У цэлым Саветам Рэспублікі сёмага склікання за дзесяць сесій, якія прайшлі, разгледжаны і адобраны 302 законапраекты, з іх 123 — аб выказванні згоды на абавязковасць для Рэспублікі Беларусь міжнародных дагавораў. 82 законы, або больш за 90 працэнтаў, прыведзены ў адпаведнасць з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

У цэлым прынятыя законы ахопліваюць розныя сферы грамадскіх адносін і прысвечаны пытанням забеспячэння нацыянальнай бяспекі і абароны суверэнітэту, дзяржаўнага будаўніцтва і мясцовага самакіравання, праваахоўнай дзейнасці, удасканаленню фінансава-эканамічнай сістэмы, росту інвестыцый, развіццю рэгіянальнага і міжнароднага супрацоўніцтва.

Акрамя таго, пільная ўвага традыцыйна была ўдзелена законам, якія рэгламентуюць найбольш хвалюючыя большасць грамадзян сферы працы і заработнай платы, адукацыі, аховы здароўя, навукі, культуры, фізічнай культуры і спорту.

Варта адзначыць, што за перыяд сёмага склікання інструментарый заканатворчасці істотна ўдасканалены. Уведзены новы фармат узаемадзеяння з выканаўчай уладай — правядзенне «ўрадавых гадзін», падчас якіх мы можам задаць хвалюючае пытанне членам Савета Міністраў і адразу ж атрымаць на яго адказ.

Створаны ў чэрвені 2021 года па даручэнні кіраўніка дзяржавы экспертны савет стаў дзейсным «прававым фільтрам», які забяспечвае ўсебаковы разгляд праектаў найважнейшых нарматыўных прававых актаў у мэтах ацэнкі палітычных, фінансава-эканамічных, сацыяльных і іншых наступстваў іх прыняцця.

За ўвесь перыяд работы экспертнага савета разгледжана 222 дакументы і толькі траціна з іх (65 дакументаў, або 29,3 працэнта) падтрымана ў поўным аб'ёме.

Адным з прыярытэтных кірункаў дзейнасці Савета Рэспублікі заўсёды была, застаецца і ёсць работа з насельніцтвам.

Кожны чалавек у нашай краіне ведае, што можа разлічваць на дзяржаўную падтрымку, клопат і дапамогу ў цяжкай сітуацыі. Гэта ўнікальнае дасягненне суверэннай Рэспублікі Беларусь, калі хочаце — наша традыцыя, частка культурнага кода нацыі.

Асабістыя прыёмы грамадзян, прамыя тэлефонныя лініі, сустрэчы з працоўнымі калектывамі, грамадзянамі па месцы жыхарства, разгляд зваротаў з выездам на месцы, удзел у рабоце грамадскіх прыёмных, выступленні ў складзе інфармацыйных груп, на дыялогавых і медыйных пляцоўках — усё гэта ў сукупнасці дазваляе адчуваць пульс грамадства, быць з людзьмі разам, жыць іх жыццём, садзейнічаючы няўхільнаму павышэнню яго якасці і паляпшэнню сацыяльнага самаадчування.

Безумоўна, у рабоце з насельніцтвам неабходна пастаянна ўдасканальвацца, дапаўняць традыцыйныя формы і метады новымі, якія адпавядаюць духу часу і актуальным запытам грамадства.

Аб рабоце Савета Рэспублікі са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб красамоўна гавораць лічбы статыстыкі. Толькі сёлета праведзена каля 180 прамых тэлефонных ліній і 370 асабістых прыёмаў грамадзян, больш за тысячу сустрэч з працоўнымі калектывамі і насельніцтвам.

Такая шырокамаштабная работа з насельніцтвам дае магчымасць вызначыць найбольш актуальныя для рэгіёнаў праблемы, бачыць агульныя тэндэнцыі развіцця і ў выніку — выпрацоўваць узважаныя і абгрунтаваныя рашэнні, накіраваныя на павышэнне дабрабыту канкрэтных населеных пунктаў, раёнаў, абласцей і краіны ў цэлым.

Многія звароты непасрэдна становяцца прадметам абмеркавання пры падрыхтоўцы праектаў законаў і іншых нарматыўных прававых актаў, а таксама рэалізацыі сацыяльна значных праектаў.

Прыемна, што падыходы, якія ініцыіруюцца і практыкуюцца Саветам Рэспублікі, сёння паспяхова выкарыстоўваюцца дзяржаўнымі органамі кіравання і самакіравання, садзейнічаючы крышталізацыі асноўных прынцыпаў работы з насельніцтвам і фарміраванню сучасных айчынных стандартаў у гэтай галіне.

Прадстаўнікам улады, грамадскіх аб'яднанняў і грамадзянам як ніколі трэба дзейнічаць разам, быць заадно — ЗА моцную і квітнеючую Беларусь. Толькі разам мы зможам захаваць і прымножыць непарушныя пастулаты беларускай дзяржавы, дзе на чале ўсяго — нацыянальныя інтарэсы і робіцца ўсё дзеля і на карысць свайго народа.

Работа Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання прыпадае на той перыяд сучаснай гісторыі, калі асабліва востра праяўляецца запыт на зацвярджэнне нацыянальнай самаідэнтычнасці, захаванне традыцыйных каштоўнасцяў, абарону гістарычнай памяці і давядзенне праўды аб гістарычным мінулым Беларусі.

Прыняты новыя знакавыя законы: «Аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму», які комплексна процідзейнічае гэтай негатыўнай з'яве, а таксама «Аб генацыдзе беларускага народа», якім прадугледжваецца юрыдычнае прызнанне генацыду беларускага народа, учыненага нацысцкімі злачынцамі і іх памагатымі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд.

Упэўнена, што і надалей Савет Рэспублікі ў цесным узаемадзеянні з усімі зацікаўленымі будзе прымаць дзейсныя меры па абароне Вялікай Перамогі ад інфармацыйнага ціску і процідзейнічаць фальсіфікацыі, папулярызаваць веды аб гэтым перыядзе гісторыі, садзейнічаць давядзенню дасягненняў гістарычнай навукі да шырокай аўдыторыі, аказваць падтрымку адпаведным праектам і ініцыятывам. Рабіць усё, каб захаваць народную памяць.

Адмысловая ўвага ўдзяляецца патрыятычнаму выхаванню моладзі. Так, пад эгідай Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі рэалізоўваецца культурна-адукацыйны праект «Цягнік Памяці», які будзе пастаянна пашыраць геаграфію і прырастаць новымі ўдзельнікамі. Сёлета беларускія і расійскія гарады баявой славы наведалі хлопцы і дзяўчаты з Беларусі, Расіі, Арменіі, Кыргызстана. Плануецца, што ў 2024-м праект аб'яднае моладзь з дзесяці краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў, а да 80-годдзя Вялікай Перамогі — з 15 былых саюзных рэспублік, якія атрымалі Перамогу над фашызмам.

Савет Рэспублікі актыўна ўключаецца ў працэс выхавання ўсяго беларускага грамадства, адказнага за ўласны лёс і будучыню сваёй Айчыны.

У тым ліку на дасягненне гэтых мэт накіраваны новы Закон «Аб асновах грамадзянскай супольнасці», які не мае аналагаў у свеце і дакладна азначае, што грамадзянскую супольнасць утвараюць тыя, хто служыць нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь, падтрымлівае дзяржаву і палітычны курс кіраўніцтва краіны.

Павышэнню статусу сям'і ў грамадстве будзе прысвечана асобнае маштабнае мерапрыемства Савета Рэспублікі, запланаванае на пачатак кастрычніка, — «Размова аб галоўным».

Асобным кірункам работы парламентарыяў у сёмым скліканні з'яўляецца маніторынг цэн. Савет Рэспублікі, па сутнасці, выступае ў ролі міжведамаснай пагаджальнай пляцоўкі, на якой выпрацоўваюцца кансенсусныя падыходы ў галіне рэгулявання цэнаўтварэння і асартыментнага пераліку прадукцыі, што рэалізоўваецца на тэрыторыі нашай краіны. Вынікам гэтай работы з'яўляецца нарматыўны прававы акт — пастанова Урада № 713 «Аб сістэме рэгулявання цэн», якая дазволіла дасягнуць мінімуму інфляцыі.

У найбліжэйшы час нашай краіне трэба прайсці сур'ёзны палітычны экзамен — выбары ў Нацыянальны сход і ў мясцовыя саветы дэпутатаў — адзіны дзень галасавання. Напярэдадні выбарчай кампаніі заклікаю членаў Савета Рэспублікі актыўна выязджаць у рэгіёны.

Кіраўнік дзяржавы даручыў парламентарыям праінфарміраваць народ аб сітуацыі, аб рабоце Парламента і нагадаць людзям аб яго функцыях. І наша задача — грунтоўнай тлумачальнай работай спрыяць таму, каб у наступнае скліканне прыйшлі найлепшыя людзі, якія будуць гатовыя вырашаць глабальныя задачы ва ўмовах няпростай сітуацыі.

Хоць шмат што змяняецца ў свеце, наш гістарычны выбар — нязменны. Саюзнае будаўніцтва з брацкай Расіяй — было, ёсць і застаецца ключавым для нашай транспарэнтнай адказнай шматвектарнай знешняй палітыкі.

Форумы рэгіёнаў, якія праводзяцца пад патранажам прэзідэнтаў Беларусі і Расіі, атрымалі далейшае развіццё і садзейнічалі паглыбленню міжрэгіянальнага супрацоўніцтва.

Мы, парламентарыі, адказныя за ажыццяўленне якаснага маніторынгу рэалізацыі прынятых на форуме рашэнняў, а таксама за выкананне саюзных праграм. Верагодна, прапанаваны да ўкаранення фармат сумесных пасяджэнняў камісій і камітэтаў Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі будзе спрыяць паспяховаму рашэнню гэтых задач.

За апошнія гады супрацоўніцтва заканадаўчых органаў Беларусі і Кітая выйшла на якасна новы ўзровень. Плануецца правядзенне сустрэчы парламентарыяў дзвюх краін для абмену нацыянальным вопытам парламенцкай дзейнасці, круглага стала па пытаннях маладзёжнай палітыкі.

Мы паслядоўна рэалізоўваем курс на паглыбленне інтэграцыйнага супрацоўніцтва з краінамі ЕАЭС, выпрацоўку ўзгодненых дзеянняў у рамках міжнародных арганізацый, створаных на постсавецкай прасторы. Прыкладам плённага міжпарламенцкага супрацоўніцтва служыць узаемадзеянне парламентарыяў Беларусі і Узбекістана.

Традыцыйна канструктыўнае ўзаемадзеянне ажыццяўляецца ў рамках Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы і Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД. Члены Савета Рэспублікі прынялі актыўны ўдзел у распрацоўцы і падрыхтоўцы мадэльных заканадаўчых актаў і рэкамендацый, якія былі выкарыстаны ў рабоце па ўдасканаленні заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Мы дакладна разумеем, што нам неабходна рухацца наперад салідарна з тымі краінамі, якія працягваюць нам руку сяброўства і гатовыя супрацьстаяць глабалісцкаму дыктату ўзмацненнем узаемнай кааперацыі і супрацоўніцтва на аснове адзіных ідэалагічных прынцыпаў і імкнення да шматпалярнага светаўладкавання.

У рамках Парламенцкай Асамблеі АБСЕ вялася паслядоўная работа па кансалідацыі намаганняў і выбудоўванні механізмаў абароны інтарэсаў Беларусі ва ўмовах недружалюбных заяў апанентаў, а таксама па супрацьдзеянні прыняццю рэзалюцый, у якіх наша краіна згадвалася ў негатыўным ключы.

Да ЕС і заходніх краін былі звернутыя заклікі спыніць антыбеларускую палітыку, адмовіцца ад ціску, вярнуцца на шлях дыялогу і канструктыўнага супрацоўніцтва.

Прадузята настроеным кіраўніцтву Парламенцкай Асамблеі АБСЕ і заходнім дэлегацыям была прадэманстравана цвёрдая пазіцыя парламента Беларусі адстойваць самастойны пункт гледжання на працэсы ў рэгіёне АБСЕ. На зімовым паседжанні ПА АБСЕ ў Вене дэлегацыі Беларусі і Расіі прынялі сумесную заяву з крытыкай «украінізацыі» пляцоўкі Асамблеі, а таксама дзеянняў калектыўнага Захаду ў дачыненні да канфлікту ва Украіне.

За сёмае скліканне падрыхтаваны і распаўсюджаны ў якасці афіцыйнага дакумента 75-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН зварот да міжнароднай супольнасці ў сувязі з сітуацыяй у Беларусі, падпісаны пятнаццаццю з паловай тысячамі дэпутатаў усіх узроўняў і членамі Савета Рэспублікі.

Больш за 40 заяў і зваротаў, прынятых Нацыянальным сходам Беларусі, накіроўваліся ў ААН, парламенты замежных краін і міжнародныя арганізацыі.

Само жыццё паказвае правільнасць прытрымлівання абранай стратэгіі — у геапалітычнай «гонцы», якая разгортваецца, мы ідзём сваім шляхам, каб потым не прыстасоўвацца да чужых канцэптаў, знаходзячы для сябе месца ва ўжо структураванай кімсьці карціне свету.

Самае галоўнае дасягненне беларускага народа — гэта тое, што ў такія рэкордна кароткія па гістарычных мерках тэрміны мы змаглі пабудаваць сваю суверэнную дзяржаву. Краіну для годнай сучаснасці і шчаснай, бяспечнай, камфортнай будучыні, краіну для народа, для жыцця ўсіх і кожнага чалавека. Мірную і стваральную Рэспубліку Беларусь.

Давайце ўсе разам зробім так, каб нам — тым, каму давераны лёс сучаснай беларускай дзяржавы, не было сорамна ні перад папярэднімі, ні перад цяперашнімі пакаленнямі, ні перад тымі, хто прыйдзе за намі. Для нас справа гонару, маральны абавязак і ганаровы абавязак — захаваць незалежную, моцную і квітнеючую Рэспубліку Беларусь.

БЫЦЬ У ЦЭНТРЫ ПАДЗЕЙ ПОБАЧ СА СВАІМІ ВЫБАРШЧЫКАМІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Менавіта з пазіцый далейшага ўмацавання беларускай эканомікі трэба падысці да законапраекта аб рэспубліканскім бюджэце на наступны год і змяненняў, якія ўносяцца ў Падатковы кодэкс.

Неабходна захаваць сацыяльную накіраванасць бюджэту, прадоўжыць работу па стварэнні зразумелых і справядлівых падатковых правіл. Ва ўмовах санкцыйнай вайны прынцыпова важна, каб нацыянальны бізнес узяў на сябе сваю долю адказнасці перад краінай і яе грамадзянамі.

Удумлівага падыходу патрабуюць і запланаваныя навацыі ў сферах аховы здароўя, сацыяльнай абароны, занятасці насельніцтва, дзяржаўнай падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, эксплуатацыі жыллёвага фонду.

Асноўныя прыярытэты міжнароднай дзейнасці Палаты прадстаўнікоў абумоўлены ўдзелам Рэспублікі Беларусь у працэсах фарміравання новага, больш справядлівага светаўладкавання.

Дэпутацкаму корпусу трэба ўзмацніць актыўнасць па ўмацаванні кантактаў з парламентарыямі дзяржаў-аднадумцаў па лініі груп дружбы, на міжпарламенцкіх пляцоўках, у фармаце народнай дыпламатыі.

Задачы застаюцца нязменнымі: настойліва і паслядоўна прасоўваць мірны, аб'яднальны парадак дня і ўмацоўваць міжнародны імідж Беларусі як надзейнага эканамічнага партнёра.

Значнымі кірункамі таксама застаюцца супрацьдзеянне інфармацыйнай вайне, абарона гістарычнай праўды і патрыятычнае выхаванне моладзі.

Яшчэ адзін прыярытэт знешняй палітыкі Беларусі — развіццё адносін з Кітаем. І задача парламентарыяў — істотна павысіць узаемадзеянне з Усекітайскім сходам народных прадстаўнікоў.

Важна кансалідаваць намаганні, выходзіць на маштабныя праекты ў эканоміцы, гандлі, інвестыцыйнай сферы, навуцы, адукацыі, дэманструючы тым самым узаемную выгаду эканамічнага супрацоўніцтва і бессэнсоўнасць палітыкі шантажу і санкцыйнага націску.

Гэтаксама трэба дзейнічаць у Міжпарламенцкім саюзе, Міжпарламенцкай Асамблеі АСЕАН, Лацінаамерыканскім парламенце.

Што да заходняга вектара, то працаваць тут сёння, вядома, няпроста. Але трэба выкарыстоўваць любыя магчымасці для прарыву інфармацыйнай блакады, каб палітыкі, якія цвяроза мысляць, і простыя грамадзяне заходніх краін даведваліся праўду пра Беларусь і пазіцыю кіраўніка нашай дзяржавы па ўсіх хвалюючых пытаннях сусветнага парадку дня.

У гэтым плане заслугоўваюць увагі ініцыятывы беларускіх дэпутатаў па ўстанаўленні нефармальных кантактаў з еўрапейскімі парламентарыямі, дзеячамі культуры, журналістамі, блогерамі, якія фарміруюць грамадскую думку. Падобную практыку трэба развіваць, роўна як і сувязі з беларускай дыяспарай.

У перыяд электаральных кампаній узрастаюць аб'ём і складанасць задач у выбарчых акругах, тым больш што дзейнасць дэпутатаў заўсёды навідавоку. І часта менавіта па ёй грамадзяне судзяць аб дзяржаве ў цэлым.

Пра што б ні ішла размова — асабістыя прыёмы, работа са зваротамі, сустрэчы ў працоўных калектывах, узаемадзеянне з мясцовымі ўладамі, — трэба пастарацца дайсці да кожнага, хто мае патрэбу ў нашай дапамозе. Дробязяў тут не бывае, бо абвостранае пачуццё справядлівасці — гэта характэрная рыса беларускага народа.

Дэпутаты павінны быць у цэнтры падзей, побач са сваімі выбаршчыкамі, ведаць, што хвалюе людзей, і трымаць на кантролі вырашэнне найбольш адчувальных для насельніцтва пытанняў, такіх як занятасць, сацыяльнае і пенсіённае забеспячэнне, работа арганізацый жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Важна не перарываць традыцыю грамадскага дыялогу, якая склалася, падтрымліваць сувязь пакаленняў.

Як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы на патрыятычным форуме, мы будзем рабіць усё ў імя міру на роднай зямлі, у імя Беларусі, якую мы ствараем на падмурку перамог, дасягненняў, вопыту і памяці нашых гераічных продкаў.

Поўныя тэксты выступленняў чытайце на сайце zviazda.by

Экалогія і палітыка

ЗАХАВАЦЬ ПУШЧУ ЯК НАБЫТАК УСЯГО ЧАЛАВЕЦТВА

Апублікаваны зварот Грамадскага каардынацыйнага экалагічнага савета да польскай грамадскасці

Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя апублікавала зварот удзельнікаў Грамадскага каардынацыйнага экалагічнага савета да польскай грамадскасці з нагоды рэферэндуму, які ў суседзяў адбудзецца менш чым праз месяц. Зварот стаў вынікам пасяджэння названага савета, якое прайшло на тэрыторыі Нацыянальнага парку «Белавежская пушча».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пасяджэнне праходзіла ў гібрыдным фармаце і транслявалася ў YouTube на рускай і англійскай мовах. Вёў мерапрыемства **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК.** Да абмеркавання ў анлайн-фармаце далучыліся ў студыях па ўсёй краіне каля двухсот чалавек. У ліку падпісчыкаў трансляцыі былі і замежныя грамадзяне.

Галоўным пасылам мерапрыемства стала відавочнае: Белавежская пушча належыць не толькі беларускаму і польскаму народам, але і ўсім, хто жыве на планеце сёння і будзе жыць потым. А ўзвядзенне агароджы на тэрыторыі трансгранічнага аб'екта Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА ставіць пад пагрозу захаванасць унікальнага прыроднага комплексу. Андрэй Худык адзначыў занепакоенасць беларусаў негатыўнымі наступствамі ад узведзенай польскім бокам агароджы. Гэты бетонны гмах раздзяліў апошні ў Еўропе найбуйнейшы масіў рэліктавага лесу. Будучыня Белавежскай пушчы ў многім залежыць ад адказу большасці палякаў на рэферэндуме, падкрэсліў Андрэй Худык.

— Калі польскі ўрад прымаў рашэнне і ўзводзіў агароджу, палітыкі не праводзілі рэферэндум і не раіліся з народам. Сёння яны, хутчэй за ўсё, плануюць узаконіць голасам народа гэтую агароджу. Але я спадзяюся, што актыўная частка польскага грамадства выкажа сваю пазіцыю, і мы будзем ведаць, што ёсць шмат людзей, якія беражліва ставяцца да прыроды і робяць усё, каб захаваць прыродны скарб для сучаснікаў і нашчадкаў, — сказаў міністр.

Намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім КРАЎЧУК нагадаў, што больш за 75 тысяч жыхароў рэгіёна выказалася супраць узвядзення агароджы сваімі подпісамі ў адпаведнай петыцыі.

— Візітнай карткай нашага рэгіёна з'яўляецца Белавежская пушча і яе сімвал — зубр, — нагадаў віцэ-губернатар. — Гэта наш нацыянальны набытак, і мы яго павінны захаваць. За год Нацыянальны парк наведваюць больш за паўмільёна турыстаў, у тым ліку дзясяткі тысяч замежных грамадзян, якім пушча цікавая найперш як запаведнік з некранутай прыродай. Дарэчы, роўна сто гадоў таму ў Парыжы на І Міжнародным кангрэсе па ахове прыроды было прынята рашэнне аб аднаўленні еўрапейскага зубра як віду. На той час у свеце налічвалася ўсяго 52 асобіны. Зараз колькасць зуброў у пушчы набліжаецца да 1400 галоў. Праведзена вялізная работа, якую выканалі беларускія і польскія спецыялісты. Спадзяюся, што выбар грамадзян Польшчы на рэферэндуме будзе накіраваны на захаванне ўнікальнай прыроднай тэрыторыі, — заўважыў Вадзім Краўчук.

Удзельнікі пасяджэння яшчэ раз нагадалі, што рашэнне аб будаўніцтве аб'екта прымалася без неабходных будаўнічай і экалагічнай экспертыз, з парушэннем шэрагу норм і прынцыпаў міжнароднага экалагічнага права. У выніку Белавежскую пушчу раздзялілі агароджа з металу і бетону вышынёй 5,5 метра і даўжынёй каля 200 кіламетраў. Вядома, падобнае збудаванне негатыўна адбіваецца на прыродных экасістэмах Белавежскай пушчы. Міністр Андрэй Худык яшчэ звярнуў увагу на той факт, што высновы беларускіх вучоных супадаюць з меркаваннем цэлага шэрагу замежных экспертаў і навукоўцаў.

Сваім бачаннем сітуацыі падзяліся супрацоўнікі Нацыянальнага парку. Яны маюць магчымасць штодня назіраць негатыўныя наступствы збудавання. **Намеснік генеральнага дырэктара ДПУ «Нацыянальны парк «Белавежская пушча» Аляксандр АЎСЕЙ** лічыць найбольшай праблемай разрыў трансгранічных экалагічных сувязяў. Паводле яго слоў, яшчэ ў ходзе будаўніцтва праведзена высечка прылеглай паласы рэліктавага лесу на польскім баку пушчы, назіралася знішчэнне жывога надглебавага покрыва. Пад патрэбы будаўніцтва знята каля сямі тысяч кубаметраў грунту, высечана каля 2,5 гектара лесу. А яшчэ ж пракладваліся дарогі для падвозу будаўнічых матэрыялаў. Усё гэта можна назваць ранамі на целе запаведнай пушчы, якія доўга не змогуць загаіцца.

Агароджа перашкаджае сезонным перамяшчэнням жывёлін, парушае шляхі іх міграцыі, што негатыўна ўплывае на генафонд папуляцый жывёльнага свету. Ужо зафіксавана парушэнне натуральных прыродных працэсаў паблізу прыпойменных участкаў рэк Лясная Правая, Нараў, Гвозна, Нараўка. Узнікае пагроза падтаплення лясоў і з'яўлення новых шляхоў распаўсюджання інвазійных раслін у прыродныя экасістэмы. У працяг тэмы **намеснік дырэктара Інстытута эксперыментальнай батанікі НАН Беларусі Руслан ЦВІРКО** акцэнтаваў увагу на неабходнасці як мага хутчэй сфарміраваць міжнародную місію экспертаў і накіраваць на тэрыторыю, якая прылягае да агароджы. Беларускія вучоныя намецілі ўжо маніторынгавыя маршруты і склалі план па мінімізацыі негатыўных наступстваў агароджы на навакольнае асяроддзе.

Сваімі меркаваннямі падчас савета падзяліліся прадстаўнікі грамадскасці. Напрыклад, **Маладзёжны пасол Мэт устойлівага развіцця, студэнтка з Гомеля Вікторыя КРУПЯНКА** сказала, што ў яе равеснікаў факт пабудовы агароджы выклікаў здзіўленне і неразуменне, як адзін бок можа прымаць рашэнне па аб'екце сусветнай спадчыны. Цалкам пагадзіўся з Вікторыяй **сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Павел АЛЕКСА.** Ён дадаў, што члены маладзёжнага саюза ўжо правялі шэраг мерапрыемстваў, якімі выказалі пратэст супраць будаўніцтва. Прадстаўнікоў беларускай моладзі падтрымаў **польскі грамадскі дзеяч, блогер Марчын МІКАЛАЕК.** Малады чалавек упэўнены, што колькасць яго землякоў, якія кіруюцца здаровым сэнсам, увесь час расце. Паводле яго меркавання, гэтая агароджа прыносіць больш шкоды, чым карысці, і яна абавязкова павінна знікнуць.

Падчас савета яго ўдзельнікі вырашылі прыняць зварот да польскай грамадскасці. Тэкст звароту быў дапрацаваны з улікам выказаных меркаванняў. «Дарагія суседзі, сябры! 15 кастрычніка бягучага года вам належыць вырашыць далейшы лёс унікальнага аб'екта сусветнай спадчыны ЮНЕСКА — Белавежскай пушчы, нашай агульнай гісторыі і гонару, — гаворыцца ў звароце. — Для беларусаў і палякаў слова «Белавежа» гаворыць пра многае! Больш за 600 гадоў унікальная ў сваім родзе Белавежская пушча існавала да нас, яе не змаглі знішчыць падчас і Першай, і Другой сусветных войнаў. Гэта нацыянальны сімвал прыроднай прыгажосці, традыцый, стойкасці, незалежнасці. Мы разам ратавалі яе пасля рабаўніцкага вынішчэння ў 1919 годзе, разам аднаўлялі папуляцыю зубра. Мы абавязаны захаваць Белавежскую пушчу з улікам яе надзвычайнай універсальнай каштоўнасці. Бо яна належыць не нам, а нашым нашчадкам».

Удзельнікі савета заклікалі грамадзян Польшчы прыняць рашэнне аб зносе агароджы, аддаць свае галасы за ачышчэнне лёгкіх Еўропы ад бетоннага іншароднага цела і, такім чынам, паклапаціцца аб будучыні, і не адчуваць сораму перад нашчадкамі. У звароце выказана спадзяванне, што здаровы сэнс суседзяў пераможа і ўнікальны прыродны аб'ект — Белавежская пушча — агульнымі намаганнямі будзе захаваны.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Дзярждоўг ЗША ўпершыню перавысіў 33 трыльёны долараў

Такія даныя прыводзіць Міністэрства фінансаў краіны, паведаміла ТАСС. Сукупны дзярждоўг ЗША склаў $33,04 трлн. Гэта рэкордны паказчык дзярждоўгу для краіны. У сярэдзіне чэрвеня ён перавышаў адзнаку $32 трлн. У пачатку 2023 года была перавышана заканадаўча ўстаноўленая на ўзроўні $31,4 трлн мяжа дзярждоўгу. У сувязі з гэтым Міністэрства фінансаў ЗША было вымушанае звярнуцца да надзвычайных мер для працягу сваіх фінансавых аперацый. У пачатку чэрвеня прэзідэнт Джо Байдэн падпісаў раней ухвалены Кангрэсам законапраект аб павышэнні мяжы дзярждоўгу. Дадзеная мера дазволіла ўладам ЗША пазбегнуць дэфолту. Закон прыпыняе мяжу дзяржаўнага доўгу да 1 студзеня 2025-га. Прадугледжваецца, што ў 2024-м фінансавым годзе на абарону будзе выдзелена $886 млрд, на медыцынскае абслугоўванне ветэранаў — $121 млрд, на іншыя неабаронныя праграмы — $637 млрд.

Японскія морапрадукты патаннелі ўдвая пасля таго, як Кітай ад іх адмовіўся

Кошт морапрадуктаў з востраў Хакайда ўпаў у сярэднім у два разы пасля забароны Кітая на іх імпарт з-за распачатага скіду ў акіян ачышчанай радыеактыўнай вады з АЭС «Фукусіма». Пра гэта паведаміла газета The Asahi Shimbun. «Рознічныя цэны на морапрадукты прэміум-класа, такія як камбала і марскія вожыкі, цяпер на 40-50 працэнтаў ніжэйшыя ў параўнанні з мінулым годам», — паведаміла выданне са спасылкай на даныя ўрада Хакайда. Кітай, які доўгі час быў найбуйнейшым імпарцёрам японскіх морапрадуктаў, прыпыніў з Хакайда пастаўкі і іншых прадуктаў харчавання. Сінгапур не ўводзіў забарон у дачыненні да прадуктаў з Японіі, аднак арганізатар традыцыйнага кулінарнага фестывалю ўжо запатрабаваў выключыць з мерапрыемства морапрадукты з Хакайда. Як вядома, галоўнае мытнае ўпраўленне КНР 7 ліпеня абвясціла аб забароне на ўвоз прадуктаў з дзесяці прэфектур Японіі ў сувязі з рашэннем японскага боку аб скідзе вады з аварыйнай АЭС «Фукусіма-1». У баках на тэрыторыі АЭС сабралася больш за 1,25 млн тон вады, якая выкарыстоўвалася для ахалоджвання рэактараў, пашкоджаных у выніку цунамі ў сакавіку 2011-га.

У Нігеры паведамілі аб вострым дэфіцыце лекаў з-за санкцый ЭКАВАС

Генеральны сакратар Міністэрства аховы здароўя Нігера Ібрагім Сулэ заявіў аб вострым дэфіцыце лекаў, які ўзрос на 25 працэнтаў пасля ўвядзення санкцый супраць ваенных улад краіны арганізацыяй ЭКАВАС, паведаміла РІА «Навіны». Чыноўнік адзначыў, што медыкі сутыкнуліся з вострым недахватам антыбіётыкаў, лекаў для лячэння дыябету і сардэчна-сасудзістых захворванняў і супрацьракавых прэпаратаў. «Для змяншэння наступстваў эмбарга пацыентам прапануюцца альтэрнатыўныя метады лячэння», — дадаў Ібрагім Сулэ. Па словах чыноўніка, асноўная частка фармацэўтычнай прадукцыі перавозілася ў Нігер праз бенінскі порт Катану, і ў выніку абмежаванняў, уведзеных ЭКАВАС, усе прэпараты былі заблакіраваны. Сулэ таксама заявіў, што новыя ўлады Нігера з пачаткам крызісу вывучаюць магчымасць пераарыентацыі каналаў паставак і вядуць перагаворы з гэтай нагоды з урадамі дружалюбных краін, у прыватнасці, з Буркіна-Фасо, Гвінеяй, Алжырам і Турцыяй.

Камунальныя стасункі

ДРОВЫ НАЗАПАШАНЫ, БАТАРЭІ ПРАВЕРАНЫ...

Рашэнне аб пачатку ацяпляльнага сезона прымае кіраўніцтва абласных, раённых і гарадскіх выканаўчых камітэтаў на падставе дадзеных аб тэмпературы паветра па абласцях і звестках «Белгідрамета». Летась гэтымі днямі ацяпленне ў сталічных установах сацыяльнай сферы першай катэгорыі спажыўцоў ужо пачалося. Сёлетняе цёплае надвор'е спрыяе таму, што батарэі нагрэюцца пазней. Да зімы прадпрыемствы ЖКГ нарыхтавалі амаль дзве тысячы м³ дроў, 4,8 тысячы тон паліўнага мазуту, заменена 295 кіламетраў цепласетак, сфарміравана 725 аварыйна-аднаўленчых брыгад (3400 чаалвек), 15 перасоўных модульных кацельных. На вуліцах гарадоў і пасёлкаў гатовыя да работы тры тысячы адзінак снегаўборачнай тэхнікі, нарыхтавана 120 тысяч тон саляна-пясчанай сумесі (траціна ад запланаванага аб'ёму).

Як і раней, старт ацяпляльнага сезона пачнецца з падключэння ацяплення ў садках, школах, бальніцах, паліклініках — калі сярэдняя тэмпература за акном апусціцца да +10 °С і ніжэй цягам пяці дзён. Жыллё, інтэрнаты, астатнія ўстановы адукацыі, тэатры, лазні пачнуць награваць, калі тэмпература стане ў сярэднім +8 °С і ніжэй не менш як пяць дзён. Астатнія адміністрацыйныя, прамысловыя і іншыя арганізацыі, па ўзгодненні з энергазабяспечвальнымі арганізацыямі, падключаць пасля поўнага ўключэння ацяплення ў жыллі. На падачу ацяплення з моманту абвяшчэння яго старту даецца тры—пяць дзён, яшчэ дзесяць дзён прадугледжана для магчымага распаветрывання сістэмы ацяплення, нагадаў **Аляксей ФІЛАНОВІЧ, начальнік аддзела энергетыкі і надзвычайных сітуацый упраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Міністэрства ЖКГ**:

— Міністэрства ЖКГ штотыднёва кантралюе падрыхтоўку да ацяпляльнага сезона па 13 асноўных паказчыках, асноўныя з якіх — замена і капрамонт катлоў, замена цепласетак, стварэнне запасаў драўнянага паліва, прафілактычны рамонт сістэм ацяплення жылля і цеплапунктаў, рамонт стыкаў і дахаў. Штомесяц правяраецца работа па 89 паказчыках, сярод якіх, напрыклад, работы па выпрабаванні абсталявання кацельных, прафілактычны рамонт абсталявання кацельных і цэнтральных цеплапунктаў, прафілактычны рамонт і агляд водаправодных і каналізацыйных сетак і збудаванняў, рамонт электраабсталявання жылля, пячнога ацяплення, паверка прылад уліку. Выкананне ўсіх гэтых паказчыкаў гарантуе надзейнае, бесперабойнае і безаварыйнае цепла- і водазабеспячэнне жылога фонду, а таксама забяспечвае функцыянаванне ўсёй інфраструктуры гарадскіх і сельскіх населеных пунктаў краіны.

Калі на радыятарах уласнікаў ёсць запорная арматура (вентылі, з дапамогай якіх можна зменшыць падачу энерганосьбіту), жыхары могуць самі вызначаць камфортны для сябе градус у пакоі. Аднак цалкам адключыць ацяпленне (перакрыць падачу энерганосьбіта) немагчыма канструктыўна — батарэя ўсё роўна застанецца ў рэжыме прапальвання. Такі падыход зручны, калі ўласнік некуды ад'язджае з жылля і яму ў гэты час непатрэбна ацяпляцца. Затое сродкі за невялікі градус у жыллі будуць сэканомленыя, бо на радыятарах разам з запорнай арматурай, як правіла, ёсць індывідуальныя прылады ўліку цяпла, якія і пакажуць меншае спажыванне энергіі.

Кожны ўласнік таксама павінен праверыць жылое памяшканне, наколькі яно падрыхтавана да зімы. Самастойна агледзець сістэму ацяплення ў кватэры на наяўнасць знешніх пашкоджанняў (цеча, іржа) радыятараў і злучэнняў, праверыць, каб вентылі свабодна паварочваліся. Няшчыльна зачыненыя вокны і дзверы могуць зніжаць энергаэфектыўнасць у кватэры і доме ў цэлым, таму неабходна агледзець, уцяпліць і заладзіць шчыліны на падаконнях, вокнах, дзвярах і вушаках, а зусім старыя вокны або дзверы — лепш замяніць. Цёплае паветра павінна свабодна цыркуляваць па пакоі, каб ён цалкам прагравaўся, таму нельга застаўляць радыятары мэбляй.

Спецыяліст удакладніў, што ў Беларусі перад стартам ацяпляльнага сезона выпрабаванні і прафілактычны рамонт скончаны на 3506 кацельных і 14,5 тысячах цепласетак. Зроблены прафрамонт 1738 цэнтральных цеплапунктаў і 3451 кацельнай. Унутраная паверхня ачышчана ў 2704 катлах і 1281 бойлеры. Гэта 100-працэнтныя паказчыкі выканання плана, падкрэсліў Аляксей Філановіч. Амаль 300 кіламетраў сетак заменена на аб'ектах водазабеспячэння (131 % ад запланаваных аб'ёмаў) і 112 кіламетраў сетак каналізацыі (116 %). Пашпарты гатоўнасці атрымалі 3409 цеплакрыніц прадпрыемстваў сістэмы ЖКГ і 80 пашпартоў іншых ведамстваў, якія забяспечваюць цяплом жылфонд.

Ірына СІДАРОК.

Спорт для ўсіх

ВАРКАЎТЫ КРОЧАЦЬ ПА ГОРАДЗЕ

Як у Гродне абнаўляюць спартыўныя пляцоўкі

Абласны цэнтр задавальняе попыт на заняткі спортам. Нядаўна тут упершыню ўстаноўлены тры варкаўтныя пляцоўкі ў сярэдніх школах, а былы футбольны стадыён прамысловага прадпрыемства поўнасцю абнавіўся. Усё гэта прызвана задаволіць запыт займацца спортам як дзяцей, так і дарослых.

У СШ № 5 ідзе ўстаноўка абсталявання для варкаўту. За працэсам сочыць **дырэктар школы Таццяна ДРОЗД**, якая не хавае сваёй радасці з нагоды з'яўлення новага спартыўнага аб'екта. Яно і зразумела. Школа — адна з найстарэйшых у горадзе: сёлета ёй споўнілася 65 гадоў, як і спартыўнаму стадыёну. Нядаўна ўся ўстанова была адноўлена, але вулічных трэнажораў тут не было. Між тым, школа папаўняецца. Дырэктар згадвае, што, калі яна прыйшла сюды шэсць гадоў таму, тут быў толькі адзін першы клас, сёлета ўжо тры. Прырост за гэты перыяд склаў больш за 200 чалавек, і цяпер тут вучыцца 550 школьнікаў.

— Наш мікрараён амалоджваецца, хоць і знаходзіцца ў старой частцы горада, далучаюцца новыя кварталы, неабходнасць такой пляцоўкі была відавочная, — сёлета паступіла прапанова ад Прэзідэнцкага спартыўнага клуба аб устаноўцы вулічных варкаўтных пляцовак у Гродне. І мы сумесна з аддзелам спорту і турызму Гродзенскага гарвыканкама выйшлі з такой прапановай да гарадскіх уладаў, каб такія пляцоўкі зрабіць ва ўстановах адукацыі. За лета былі падрыхтаваны ўсе неабходныя тэхнічныя даныя, пакладзена зялёнае штучнае пакрыццё для таго, каб мінімізаваць траўмы і наогул для эстэтыкі і зручнасці заняткаў. Гэтая паслуга для жыхароў мікрараёна бясплатная, трэнажоры ў свабодным доступе да 10 гадзін вечара, тут разам са школьнікамі могуць займацца і дарослыя. — заўважыў Андрэй Сяманчык.

мы доўга чакалі падобны аб'ект, бо ён робіць нашу школу больш сучаснай, — упэўненая Таццяна Дрозд.

Пакуль варкаўты ўстаноўлены ў трох школах, паведаміў **начальнік аддзела адукацыі Гродзенскага гарвыканкама Андрэй СЯМАНЧЫК**. Ён адзначыў, што СШ № 5 выбралі невыпадкова. Тут нядаўна зроблены рамонт школьнага стадыёна, абноўлена футбольнае поле, яго засеялі спартыўнай травой, бегавыя дарожкі прывезены ў належны стан, валейбольная і баскетбольная пляцоўкі таксама адпавядаюць нормам. Наогул спальныя мікрараёны пакуль не маюць адпаведных спартыўных пляцовак, куды змогуць прыходзіць і мясцовыя жыхары.

Такія вулічныя спартыўныя пляцоўкі з'яўляюцца першымі ў горадзе, хоць упраўленне капітальнага будаўніцтва горада ўжо займаецца ўстаноўкай «варкаўтаў» у новых мікрараёнах. Аднак школьныя пляцоўкі маюць адрозненне — яны сертыфікаваныя, шматфункцыянальныя, антывандальныя. У цэлым на стадыёне можна займацца як сілавымі трэніроўкамі, так і гуляць у вулічны баскетбол, валейбол, у тым ліку пляжны. Аб'ект будзе працаваць увесь дзень, выкарыстоўвацца для актыўнага сямейнага адпачынку. Плануецца, што супрацоўніцтва з Прэзідэнцкім спартыўным клубам працягнецца і налета. Гэта значыць, кола аматараў варкаўту пашырыцца.

Яшчэ адным значным аб'ектам стаў абноўлены футбольны стадыён. Раней ён належаў аднаму з будаўнічых прадпрыемстваў горада, а некалькі гадоў таму быў перададзены гродзенскаму футбольнаму клубу «Нёман». Перад вачыма паўстаў аб'ект, што называецца, як на карцінцы.

— Вы не бычылі, што тут было раней, — заўважыў **начальнік аддзела спорту і турызму Гродзенскага гарвыканкама Сяргей КУЛАКОЎ**. — Цяпер мы бачым сучасны стадыён з футбольным пакрыццём, які будзе выкарыстоўвацца для патрэб футбалістаў спартыўных школ, а таксама жыхароў найбліжэйшых мікрараёнаў. Стадыён з самым сучасным абсталяваннем, газонам, вельмі прыгожы. З пакрыццём дапамагла Беларуская федэрацыя футбола, усе работы выкананыя за кошт сродкаў футбольнага клуба «Неман» пры падтрымцы абласнога і гарадскога бюджэтаў.

Рэканструкцыя працягвалася больш за год. Сёння ступень гатоўнасці — амаль 90 працэнтаў. Засталося завяршыць асобныя работы. Напрыклад, абсталяваць відэакантроль і давесці да ладу адміністрацыйны будынак, дзе размешчаныя раздзявальні і душавыя, а таксама будзе захоўвацца спартыўны інвентар.

Само поле гатовае да прыёму спартсменаў і аматараў спорту. Тут можна праводзіць як трэніроўкі, так і матчы — для гэтага створаны ўсе ўмовы. Поле таксама можна здаваць у арэнду для правядзення спартыўных гульняў. Такі фармат, па словах спецыяліста, карыстаецца попытам у насельніцтва.

Сяргей Кулакоў адзначыў, што дзіцячая спартыўная школа ФК «Нёман» актыўна ствараe філіялы футбольнай школы ў мікрараёнах горада. Яны будуць знаходзіцца ў крокавай даступнасці для вучняў школ, жыхароў мікрараёна. Месца таксама выбрана невыпадкова — стадыён знаходзіцца паблізу жылога мікрараёна побач з агульнаадукацыйнай школай. Гэта, у сваю чаргу, дазволіць адабраць таленавітых дзяцей у спартыўныя клубы і будзе садзейнічаць удасканаленню іх спартыўных дасягненняў.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

ЗАПАЛІЦЬ СЭРЦЫ І ДУШЫ

Важна, як і кім будуць данесены духоўныя каштоўнасці да кожнага дзіцяці

Рэспубліканскі маладзёжны праваслаўны патрыятычны праект «Малюся за Беларусь», абласная патрыятычная акцыя «Марафон памяці», дэкада бацькоўскай любові, Пакроўскі кірмаш, Калядны і Велікодны балі, конкурс творчых эсэ «Сто слоў пра веру», конкурс па стварэнні макетаў храмаў «Храм як крыніца духоўнасці», акцыя «Ангелы Раства», тэлеграм-канал «Паспяховае бацькоўства»... Усё гэта прыклады эфектыўнага педагагічнага вопыту па духоўна-маральным і патрыятычным выхаванні падрастаючага пакалення на аснове традыцыйных каштоўнасцяў беларускага народа і духоўнай спадчыны Беларускай праваслаўнай царквы. Ім дзяліліся ўдзельнікі круглага стала, які прайшоў у Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. У цэнтры ўвагі была дзейнасць рэсурсных цэнтраў па духоўна-маральным і патрыятычным выхаванні. Прычым абмяркоўваўся не толькі вопыт, але таксама праблемныя моманты ў іх рабоце і перспектывы.

ХРЫСЦІЯНСКІ ПОГЛЯД НА АСОБУ І СЯМ'Ю

Трэба адзначыць, што цяпер у Беларусі рэалізоўваецца ўжо пятая Праграма супрацоўніцтва паміж Міністэрствам адукацыі і Беларускай праваслаўнай царквой па развіцці і ўмацаванні духоўна-маральнага і патрыятычнага выхавання дзяцей і моладзі. Аб цесным узаемадзеянні адукацыйнай галіны і Праваслаўнай царквы сведчаць шматлікія разнастайныя сумесныя мерапрыемствы: канферэнцыі, конкурсы, форумы, адукацыйна-асветныя чытанні, інавацыйныя праекты і г. д. У новым навучальным годзе духоўна-маральнае выхаванне вучняў застаецца адным з прыярытэтаў выхаваўчай работы ва ўстановах адукацыі.

У сваім выступленні перад педагогамі **рэктар Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Алег ДЗЯЧЭНКА** ахарактарызаваў тэндэнцыі сучаснай рэлігійнай і канфесійнай самаідэнтыфікацыі насельніцтва Беларусі.

— У нашай шматканфесійнай краіне дзейнічае 25 рэлігійных кірункаў, а ўсяго рэлігійных арганізацый налічваецца больш як 3,5 тысячы. У гэтых умовах надзвычай важная роля належыць дзяржаве як галоўнаму рэгулятару развіцця канфесійных працэсаў, гаранту захавання міжканфесіянальнага міру і грамадзянскай згоды на аснове рэалізацыі замацаванага ў нацыянальным заканадаўстве права грамадзян на свабоду сумлення.

Так гістарычна склалася, што з эпохі Полацкага княства і да сёння праваслаўе адыгрывае вядучую ролю ў фарміраванні духоўных, культурных, нацыянальных і дзяржаўных традыцый беларускага народа. Гэта тлумачыць, чаму менавіта з Праваслаўнай царквой мы сёння вельмі цесна працуем у плане рэалізацыі выхаваўчых праграм для дзяцей і моладзі.

Паводле розных сацыялагічных апытанняў, пазіцыянуе сябе як рэлігійныя звыш 60 працэнтаў беларусаў, астатнія прытрымліваюцца іншых поглядаў на рэлігію. І гэта зусім не абавязкова атэісты, бо сапраўдных атэістаў у грамадстве зусім няшмат — у межах аднаго працэнта. Ёсць скептыкі, агностыкі, ды ўвогуле абыякавыя да рэлігійных пытанняў людзі... Але нам трэба ўлічваць светапоглядныя інтарэсы і рэлігійныя перакананні ўсіх законных прадстаўнікоў нашых выхаванцаў. Мы павінны захаваць міжканфесійны мір і павагу да ўсіх рэлігій, якія падтрымліваюць нашу дзяржаву, і ў першую чаргу да Беларускай праваслаўнай царквы, — падкрэсліў Алег Дзячэнка. — Наша мэта — далучыць дзяцей да высокіх маральных канонаў, якія з'яўляюцца жыццесцвярджальнымі, агульначалавечымі для ўсіх (і для рэлігійных людзей, і для свецкіх) і знаходзяцца ў адзінай крыніцы нацыянальных беларускіх традыцый. Выхаваўчая работа з навучэнцамі накіравана на азнаямленне з каштоўнасцямі і духоўнымі традыцыямі праваслаўя, якія рэтрансліруюцца ў грамадства, кожную сям'ю і кожнаму чалавеку.

Задача — праз школу, праз рэсурсны цэнтр па духоўна-маральным і патрыятычным выхаванні далучыць кожнае дзіця да традыцыйнай духоўнасці, выхаваць духоўна багатага і гарманічнага чалавека. А далей няхай кожны сам для сябе вырашае, заставацца яму на пазіцыях свецкага светапогляду ці не. Але праз усё жыццё чалавек пранясе павагу да праваслаўя як да захавальніка сістэмы высокіх маральных хрысціянскіх стандартаў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Праз усё жыццё чалавек пранясе павагу да праваслаўя

Алег Дзячэнка заўважыў, што ва ўмовах новых знешніх выклікаў, у тым ліку ідэалагічных, актуалізавалася задача па ўзмацненні духоўна-маральнага і патрыятычнага выхавання моладзі. У сувязі з гэтым на новы ўзровень выходзіць супрацоўніцтва Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Беларускай праваслаўнай царквы, якія ў рамках сацыяльнага партнёрства ажыццяўляюць шырокі комплекс ідэалагічных і выхаваўчых мерапрыемстваў.

ПРАЗ ЭМОЦЫІ І ПАЧУЦЦІ

«Духоўна-маральнае выхаванне павінна быць арганічна ўплецена ў адукацыйны працэс і складаць яго неад'емную частку, — лічыць рэктар Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. — На развіццё духоўнасці, Дзячэнка. — У сваёй рабоце нам трэба выкарыстоўваць сучасныя падыходы, укараняць новыя формы і метады. Патрэбная прафесійная і светапоглядная падрыхтоўка педагогаў. Важна, як і кім будуць данесены духоўныя асновы да кожнага дзіцяці. Педагогі павінны індывідуальна падыходзіць да кожнага дзіцяці, абавязкова ўцягваць у сваю работу бацькоў. У дапамогу нам усім — рэлігійны інструментарый, які праз эмоцыі, пачуцці і высокія словы дапаможа замацаваць хрысціянскі погляд на асобу, сям'ю і краіну.

У каштоўнаснай спадчыне праваслаўе назапасіла вялікі вопыт, і яго трэба выкарыстоўваць у выхаванні падрастаючага пакалення. Але хачу папярэдзіць: нельга ўсю работу перакладваць на плечы святароў. Работнікі рэсурсных цэнтраў павінны мець сваё прафесійнае бачанне, як акуратна падысці да вырашэння ўсіх пытанняў, не напужаць і не адштурхнуць дзяцей і іх бацькоў.

ВЕРНЫЯ СЛОВЫ І ВЕРНЫЯ СЭНСЫ

Дыстанцыйна да ўдзельнікаў пасяджэння звярнуўся **старшыня Сінадальнага аддзела Беларускай праваслаўнай царквы па супрацоўніцтве са свецкімі ўстановамі адукацыі, кандыдат багаслоўя протаіерэй Фёдар ПОЎНЫ.**

— Пачынаючы навучальны год, запаліце ў сабе агеньчык (нават калі ён тлее ці згас) у прадчуванні нязведанага, творчага, новага. У апошні час мы ўсё ўскладнілі, мы разбілі жыццё на працэсы, на сферы дзейнасці, так бы мовіць, разбілі чашу, а сабраць яе не можам. Навучанне і выхаванне — гэта не асобныя кірункі дзейнасці чалавека. Мы не выпадаем з жыцця на восем гадзін у суткі. І калі чалавек, тым больш настаўнік, педагог, не любіць сваю работу, сваё служэнне дзецям, значыць, ён не любіць і сваё жыццё. Неяк мне падумалася, а хіба дзеці ў школе вучацца? Не, не і яшчэ раз не. Дзіця ў школе пражывае свае найлепшыя гады, і, напэўна, цалкам натуральна, што ён хоча ўсяго самага сапраўднага, яркага і ідэальнага.

Магчыма, не ўсе падзяляюць маю думку, але я лічу, што дзеці даюць настаўнікам намнога больш, чым тыя — дзецям: яны аддаюць ім сваё дзяцінства, энергію, свой чысты погляд на свет. А мы, дарослыя, часта, вобразна кажучы, трансліруем ім свае шэрыя штампы, раўнадушша і асабістыя крыўды на жыццё. Між іншым, мы павінны вучыць мудрасці, накіроўваць іх энергію, а не падаўляць, павінны вучыць выбіраць праведны шлях. Праведны азначае правільны... Калі кожнае слова педагога будзе несці ў сабе ўнутраную сілу, перакананне, ідэю, яно будзе дзейсным.

Фёдар Поўны падкрэсліў, што рэсурсныя цэнтры па духоўна-маральным і патрыятычным выхаванні створаныя для таго, каб быць свяцільнямі, крыніцамі энергіі, творчасці і ініцыятыў. «Кажучы сучаснай мовай, рэсурсныя цэнтры — гэта батарэйкі, сервер, таму запальвайце перш за ўсё свае душы, — параіў ён. — Няхай агеньчык свеціцца ў вашых вачах, адчуваецца ў вашым жыцці. А як падтрымліваць агонь, спытаецце вы. Адказваю: ва ўзаемадзеянні, бо акумулятар аўтамабіля зараджаецца падчас руху. Калі пакінуць фары ўключанымі без работы рухавіка, акумулятар хутка разрадзіцца. А яшчэ святло гасне, калі адно са звёнаў у электрычным ланцугу рвецца. Вось і хачу пажадаць нам усім у новым навучальным годзе больш цеснага супрацоўніцтва і канструктыўных плённых зносін адзін з адным: з Царквой, з прадстаўнікамі мясцовай улады, ідэолагамі, педагогамі з розных школ, з сем'ямі дзяцей. Нам вельмі не хапае ўзгодненай работы рэсурсных цэнтраў і епархіяльных аддзелаў рэлігійнай адукацыі і катэхізацыі. Аддзелы гатовыя дапамагаць педагогам і прапаноўваць ім свае напрацоўкі. Плануйце сваю работу разам, і вы знойдзеце верныя словы і верныя сэнсы, менш будзе памылак. Думайце найперш пра людзей, так вашы справы стануць больш чалавечнымі, а мерапрыемствы, якія прапануеце моладзі, больш прыцягальнымі. Дэвіз сённяшняга дня — «Раіцца, раіцца і яшчэ раз раіцца!»

Беларускі народ — праваслаўны па поглядах, толькі гэта зусім не азначае, што мы недружалюбна ставімся да іншых нацый і канфесій, наадварот, толькі пры праваслаўнай большасці квітнее ў Беларусі міжканфесійны мір і дыялог. Гэта перакананўча даказвае наша гісторыя. Я хачу ўсіх папрасіць — не ўкладвайце ў духоўнасць тое, што не з'яўляецца ёй. Не зводзьце рэлігію да абрадавасці. Раскрывайце яе дух, жывіце ім. Давайце самі будзем жыць тым, чаму мы вучым...»

АД ПРАКТЫКІ — ДА НАВУКІ

На дзейнасці бацькоўскіх універсітэтаў спынілася ў сваім выступленні **кансультант Міністэрства адукацыі Ларыса ЕМЯЛЬЯНЧЫК:**

— Мы не можам выхоўваць нашых дзяцей без шанавання сям'і, без захавання традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, сфарміраваных у нашым грамадстве. Таму ставім задачу актывізаваць і ўдасканальваць дзейнасць бацькоўскіх універсітэтаў. Яны з'яўляюцца нашым бацькоўскім усенавучам, выконваюць ролю бацькоўскай асветы і сёння вельмі актуальныя. Нацыянальным інстытутам адукацыі і Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэтам праведзена вялікая работа па распрацоўцы інфармацыйных матэрыялаў, сцэнарыяў правядзення бацькоўскіх універсітэтаў на ўсіх узроўнях адукацыі. Задачы прыцягнення мам і тат да дзейнасці школы павінны ставіцца перад усімі маладымі педагогамі. Бацькоўскі ўніверсітэт не можа дапускаць фармалізму, ён павінен быць жывым і практыка-арыентаваным.

Па словах Ларысы Емяльянчык, летась ва ўстановах адукацыі ствараліся асветніцкія саветы: «Задача на бягучы год — удыхнуць у іх свежае дыханне, пазначыць іх ролю і месца ў духоўна-маральным і патрыятычным выхаванні падрастаючага пакалення. Як мы бачым, гэта павінны быць грамадскія кансультатыўныя саветы, куды ўвойдуць педагогі, бацькі, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў, святары».

Закранаючы дзейнасць рэсурсных цэнтраў, Ларыса Емяльянчык падкрэсліла, што яна павінна быць больш сістэмнай і мэтанакіраванай. Каардынацыяй работы па стварэнні і функцыянаванні рэгіянальных цэнтраў будзе займацца Рэспубліканскі рэсурсны цэнтр па духоўна-маральным і патрыятычным выхаванні, які дзейнічае на базе Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Жыццё пастаянна дыктуе нешта новае, і трэба своечасова ўлавіць, што адбываецца, што неабходна развіваць і маштабіраваць на ўсю краіну. Практыка падштурховане да сур'ёзнай навуковай работы, звязанай з дзейнасцю рэсурсных цэнтраў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
20 верасня 2023 г. № 34 (720)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ВАЖНЫЯ ШМАТГРАННЫЯ АКЦЭНТЫ

Падрабязнасці рабочай паездкі Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ у Віцебскую вобласць

Фота БелТА.

На мінулым тыдні Наталля Качанава два дні працавала на Віцебшчыне. Яна пабывала ў Наваполацку, Гарадку і ў абласным цэнтры. Пытанні, якія закраналіся падчас сустрэч на месцах, былі разнапланавыя, але ўсе важныя.

У фармаце адкрытага дыялогу

Першым пунктам на маршруце спікера верхняй палаты парламента стаў Наваполацк, дзе Наталля Іванаўна правяла сустрэчу з актывам Беларускага саюза жанчын Віцебскай вобласці. Падобныя дыялогавыя пляцоўкі адбыліся ўжо ў Гомельскай, Гродзенскай і Брэсцкай абласцях. «Я бачу, якую цікавасць выклікаюць гэтыя сустрэчы ў жанчын, якія жывуць інтарэсамі нашай краіны, задачамі і праблемамі, што ёсць у нашым грамадстве», — адзначыла Наталля Качанава.

Напярэдадні Дня народнага адзінства Наталля Качанава нагадала, што ў найбліжэйшыя гады ў Беларусі адбудуцца важныя палітычныя падзеі — беларускае грамадства чакаюць электаральныя кампаніі. Зрабіць правільны выбар нескладана, калі хочаш сваёй радзіме дабрабыту і каб твае дзеці жылі ў свабоднай і шчаслівай краіне. Для гэтага дастаткова памятаць урокі гісторыі і сёння пісаць праўдзівую гісторыю, пераканана спікер: «Каб будучыя пакаленні памяталі ўрокі Вялікай Айчыннай вайны, генацыд, які перажыў наш народ, не забыліся пра гэта і не паддаліся на правакацыі. Якая будзе краіна, залежыць ад моладзі. Нам трэба захаваць яе цяпер. Наша задача — зрабіць усё, каб мы былі адзіныя як ніколі. І Прэзідэнт пастаянна праводзіць гэтую работу, пастаянна сустракаючыся з людзьмі, з кіраўнікамі іншых краін. На гэтыя мэты накіраваны законы, якія прымаюцца ў нашай дзяржаве».

Асобнай тэмай сустрэчы з жаночым актывам стала дэмаграфічная бяспека. Наталля Іванаўна адзначыла, што такімі льготамі і прэферэнцыямі, якія ёсць у нас, нямногія дзяржавы могуць пахваліцца. У Беларусі выплачваюцца розныя віды дапамог. Усе пытанні, якія вырашаюцца ў ахове здароўя, адукацыі, органамі працы і абароны, сёння накіраваны на падтрымку сем'яў.

Каля 600 жанчын Віцебшчыны падчас адкрытага дыялогу ўзнялі розныя тэмы. Іх цікавілі праблемы захавання традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, пытанні выхавання дзяцей, эканамічнага развіцця, аховы здароўя, адукацыі. Старшыня верхняй палаты парламента анансавала мерапрыемства ў Полацку — «Размова пра галоўнае», — якое плануюць правесці з сем'ямі, абмеркаваць пытанні выхавання падрастаючага пакалення.

Без здаровай сям'і не будзе дзяржавы

Назаўтра Наталля Качанава прыняла ўдзел у пасяджэнні Гарадоцкага райвыканкама. На парадку дня было пытанне аб ходзе рэалізацыі ў Гарадоцкім раёне мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» на 2021—2025 гады.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Ад урокаў памяці да геапалітыкі

ТРАДЫЦЫЙНА мінулы тыдзень выдаўся актыўным і плённым у рабочым графіку членаў Савета Рэспублікі. Сенатары бралі ўдзел у мерапрыемствах, прымеркаваных да Дня народнага адзінства, у тым ліку праводзілі ва ўстановах адукацыі Адзіны ўрок памяці «Мы — адзіны! Мы — сэрца вялікай краіны!». Акрамя таго, парламентарыі сустракаліся з працоўнымі калектывамі і моладдзю, наведвалі прадпрыемствы, выступалі падчас дыялогавых пляцовак.

• Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Валерый БЕЛЬСКІ прыняў удзел у мерапрыемстве, прысвечаным Дню работнікаў лесу. Ад імя Савета Рэспублікі і асабіста спікера верхняй палаты парламента сенатар павіншаваў работнікаў і ветэранаў галіны са святам, зачытаў прывітальны адрас. Падчас свайго выступлення ён адзначыў, што лес дае нам цеплыню, прытулак, прахалоду ў спякоту. «Лес дае нам прытулак у цяжкія, страшныя часіны, — нагадаў гісторыю Валерый Бельскі. — Лес мабілізуе нашы намаганні і робіць багацейшымі нашых людзей». Парламентарый падзякаваў работнікам галіны за намаганні па захаванні і прымнажэнні нацыянальнай прыроднай спадчыны і заўважыў, што нямногія краіны свету могуць атрымліваць асалоду ад такіх багаццяў, якія ёсць у нашай краіне. Сенатар заклікаў шанаваць, любіць і памнажаць іх.

• Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ прыняў удзел у анлайн-пасяджэнні геапалітычнай групы «Еўразія» Міжпарламенцкага саюза. Група «Еўразія» забяспечвае каардынацыю сумесных дзеянняў парламенцкіх дэлегацый дзяржаў — удзельніц СНД у МПС. Падчас пасяджэння заслуханы прэзентацыі кандыдатаў на пасаду старшыні МПС. Выбары новага старшыні саюза пройдуць падчас 147-й Асамблеі Міжпарламенцкага саюза ў Анголе, якая плануе адбыцца ў кастрычніку.

• Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, старшыня Гродзенскага аб'яднання прафсаюзаў Віктар ЛІСКОВІЧ прыняў удзел ва ўрачыстай цырымоніі ўстаноўкі колбы для збору манет, якія будуць пераплаўлены і выкарыстаны для вырабу памятнага знака «Жывая памяць удзячных пакаленняў» на Паклоннай гары ў Маскве. Цырымонія адбылася ў культурным цэнтры «Фестывальны» горада Гродна. Маштабную акцыю рэалізуе дабрачынны фонд імя Аляксея Талая. Сенатар адзначыў, што ў самой назве «Жывая памяць удзячных пакаленняў» адлюстраваны важны сэнс патрыятычнай ініцыятывы: захаваць праўду аб падзеях ваенных гадоў і аддаць даніну памяці нашым продкам. «Гэты праект яшчэ мацней аб'яднае брацкія народы Беларусі і Расіі», — выказаў упэўненасць парламентарый.

• Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, рэктар Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Алег ДЗЯЧЭНКА правёў дыялогавую пляцоўку «Адзінства беларускага народа — асноўны фактар захавання і ўмацавання суверэнітэту і незалежнасці краіны», прымеркаваную да Дня народнага адзінства. Удзел у мерапрыемстве прынялі слухачы курсаў павышэння кваліфікацыі з усіх рэгіёнаў краіны, а таксама палітычны аглядальнік дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання «Сталічная тэлебачання» Яўген Пуставой. Удзельнікі дыялогавай пляцоўкі абмеркавалі пытанні захавання гістарычнай памяці, удасканалення інфармацыйна-ідэалагічнай работы з насельніцтвам ва ўмовах новых геапалітычных выклікаў.

Вераніка КАНЮТА.

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БЯСПЕКА, САЦЫЯЛЬНЫЯ ГАРАНТЫІ І АХОВА ЗДАРОЎЯ

Сенатары расказалі, над чым будуць працаваць падчас чарговай сесіі

УЧОРА адбылося адкрыццё адзінаццатай сесіі Савета Рэспублікі. Як падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА, сімвалічна, што яно праходзіць адразу пасля дзяржаўнага свята — Дня народнага адзінства і напярэдадні Міжнароднага дня міру, заснаванага Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый як дзень адмовы ад гвалту і спынення агню. І ўсё гэта — у 2023 годзе, аб'яўленым у Беларусі Годам міру і стваральнай працы, што не толькі вызначае накіраванасць работы сенатараў у маючую адбыцца сесію, але і адпавядае агульнаму духу палітычнай, дзяржаўнай і грамадскай дзейнасці ў нашай краіне.

Фота БелТА.

Як адзначыла **член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Эльвіра САРОКА,** адзінаццатая сесія ўнікальная тым, што адкрываюць яе сенатары ў цяперашнім саставе, а закрываць будуць члены Савета Рэспублікі наступнага склікання. Яна падкрэсліла, што сенатары гатовы працаваць над законамі, накіраванымі на тое, каб палепшыць жыццё грамадзян Беларусі.

— Кожны закон выклікае ў нас шырокую дыскусію. Яго нельга прыняць на адным меркаванні. Абмеркаванняў, сумненняў заўсёды шмат, але падчас дыскусій ў камісіях мы прыходзім да адзінага выніку, — падзялілася Эльвіра Сарока.

Быў прыняты і рыхтуецца да абмеркавання шэраг законаў па бяспецы нашай дзяржавы.

— Жыццё паказала, што нам неабходна рабіць, — адзначыла Эльвіра Сарока. — Закон аб генацыдзе беларускага народа аказаўся вельмі своечасовым. Падчас святкавання Дня народнага адзінства мы ўсе бачылі, як людзі з кожным годам больш аб'ядноўваюцца. Мы ўсе разумеем, асабліва калі цяпер знешнія ворагі не даюць нам спакойна жыць, што мэта ў нас адна — наша дзяржава, захаванне міру і спакою для нашых дзяцей і ўнукаў.

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына СТАРАВОЙТАВА адзначыла, што на гэтай сесіі рыхтуецца да разгляду шэраг законапраектаў сацыяльнай накіраванасці — законы, якія датычацца сацыяльнага абслугоўвання, а значыць, усіх грамадзян нашай краіны. Гэта ў тым ліку і забеспячэнне сацыяльнымі паслугамі з улікам індывідуальнага падыходу.

— Па зваротах грамадзян мы ўбачылі, што неабходна вырашаць асобныя пытанні, якія датычацца якаснага забеспячэння і арганізацыі сацыяльнага абслугоўвання пажылых людзей і дзейнасці арганізацый, якія забяспечваюць гэту работу.

Яшчэ адзін важны законапраект, які будзе разгледжаны, — Закон аб ахове здароўя.

— Ён павінен адрэгуляваць дзейнасць універсітэцкіх клінік, ардынатуры, пытанні, якія тычацца арганізацыі работы і фінансавання тых устаноў аховы здароўя, якія праходзяць ці не прайшлі акрэдытацыю, фінансавання неакрэдытаваных арганізацый, і іншыя пытанні, актуальныя для сістэмы аховы здароўя, — дадала Ірына Старавойтава.

А ў першы дзень работы адзінаццатай сесіі сенатары адобрылі прыпыненне дзеяння дагавора аб звычайных Узброеных сілах у Еўропе ў дачыненні да Польшчы і Чэхіі. Ён прадугледжвае абмежаванне сумарных узроўняў звычайных узбраенняў і тэхнікі па пяці асноўных катэгорыях (танкі, баявыя браніраваныя машыны, артылерыя, ударныя верталёты і баявыя самалёты), а таксама механізмы праверкі выканання абавязацельстваў (абмен інфармацыяй і інспекцыі).

Рэч у тым, што Беларусь у поўным аб'ёме выконвала свае абавязацельствы па гэтым дагаворы. У рамках яго рэалізацыі наша краіна прыняла 334 інспекцыі ад дзяржаў — удзельніц ДЗУСЕ і правяла 242 інспекцыі на тэрыторыях дзяржаў-удзельніц. Аднак 21 сакавіка 2023 года ўрад Польшчы прыняў рашэнне аб невыкананні ДЗУСЕ ў адносінах да Беларусі. Чэхія паведаміла аб прыпыненні сваіх абавязацельстваў яшчэ ў жніўні 2022 года.

У рамках мер у адказ на недружалюбныя крокі Польшчы і Чэхіі Беларусь таксама прыпыняе выкананне абавязацельстваў па ДЗУСЕ ў адносінах да названых краін да паўнацэннага аднаўлення выканання імі сваіх абавязацельстваў па дагаворы.

— Гэта крокі ў адказ, якія зроблены нашымі апанентамі, у прыватнасці Польшчай і Чэхіяй. Дагавор датычыцца праверкі звычайнага ўзбраення. Мы яго прыпыняем, бы ведаем, якія адбываюцца цяпер падзеі, якія адносіцца Польшча да Беларусі і колькі прынята і прымаецца мер і рашэнняў, якія працягваюць тэндэнцыю нагнятання абстаноўкі на граніцах з нашай краінай. У гэтым напрамку рухаецца і Чэхія, — адзначыў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Валерый ГАЙДУКЕВІЧ.**

Акрамя таго, Савет Рэспублікі адобрыў прыпыненне дзеяння пагаднення з Украінай аб абароне правоў перасяленцаў і іх сем'яў.

— Праект закона падрыхтаваны ў рамках мер у адказ на недружалюбныя дзеянні Украіны ў дачыненні да Рэспублікі Беларусь. Прыняцце законапраекта будзе садзейнічаць абароне нацыянальных інтарэсаў Беларусі і дасць магчымасць вызваліць нашу краіну ад абавязацельстваў выконваць гэта пагадненне на працягу перыяду прыпынення, — патлумачыў Валерый Гайдукевіч.

Таксама сенатары ратыфікавалі пагадненне паміж Беларуссю і Іранам аб перадачы асуджаных асоб.

Алена КРАВЕЦ.

ВАЖНЫЯ ШМАТГРАННЫЯ АКЦЭНТЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Фота БелТА.

«Адна, на мой погляд, з асноватворных дзяржаўных праграм — «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь». Гэта тое, што вельмі важна для нашай краіны і, мабыць, для развіцця любой іншай. Вы ведаеце, якая ўвага ўдзяляецца ў нас сістэме аховы здароўя. Каб выконваць задачы, якія стаяць перад ёй, вылучаюцца сур'ёзныя сродкі. Таксама мы разумеем, што нам трэба больш адказна ставіцца да ўсіх пытанняў. Калі казаць пра дэмаграфічную бяспеку, то мы павінны працаваць усе разам для таго, каб статус сям'і, традыцыйныя сямейныя каштоўнасці, тое, што прапісана ў асноўным законе нашай краіны — Канстытуцыі, — рэалізоўвалася на практыцы. Мы разумеем, што без моцнай сям'і і без таго, што нашы маладыя сем'і будуць нараджаць дзяцей, вядома, будучыні няма. Ніякі штучны інтэлект, інтэрнэт-рэсурсы і ўсё астатняе не заменіць чалавека. Якімі б высокатэхналагічнымі ні ствараліробатаў, чалавек усё роўна на чале ўсяго, а ў нашай краіне тым больш. Падтрымка, якая аказваецца сям'і з боку дзяржавы, сапраўды значная», — падкрэсліла Наталля Іванаўна.

Галоўны ўрач Гарадоцкай цэнтральнай раённай бальніцы Валерый Самсонаў расказаў, што ва ўстанове аховы здароўя абслугоўваюцца звыш 20,7 тысячы чалавек, уключаючы больш за 3,6 тысячы дзяцей. Медыцынскія паслугі на сяле аказваюцца ў 14 ФАПах і 7 урачэбных амбулаторыях, для прыёму пацыентаў у аддаленых населеных пунктах выкарыстоўваецца перасоўны ФАП. Асаблівую ўвагу Наталля Качанава звярнула на правядзенне рэальнай, а не фармальнай дыспансерызацыі насельніцтва:

«Да мяне пастаянна паступаюць звароты, у якіх людзі з рэгіёнаў просяць накіраваць іх у медыцынскія ўстановы больш высокага ўзроўню — абласнога, рэспубліканскага. А гэта паказчык таго, што ў раёнах трэба больш працаваць з насельніцтвам. Усеагульная дыспансерызацыя ні ў якім разе не павінна ператварыцца ў фармальнасць, праводзіцца для птушачкі на паперы. Бо справа зусім не ў лічбах, а ў тым, каб чалавеку, кім бы ён ні працаваў, якога б узросту ні быў, была аказана своечасовая кваліфікаваная дапамога».

Валерый Самсонаў падкрэсліў, што ў Гарадоцкі раён з 2018 да 2023 года прыбылі 47 маладых спецыялістаў, з іх працягваюць працаваць 28. З пачатку жніўня гэтага года ў рэгіёне з'явіўся ўрач-афтальмолаг, хутка да працы прыступіць яшчэ адзін малады урач-хірург. Такая замацаванасць тлумачыцца блізкасцю да абласнога цэнтра. Амаль усе медработнікі, якія прыходзяць у раён, з'яўляюцца выпускнікамі Віцебскага медуніверсітэта і медкаледжа, і пасля адпрацоўкі частка спецыялістаў з'язджае ў Віцебск. «Вы павінны зацікавіць моладзь, на сваім прыкладзе паказаць, што можна паспяхова працаваць у раёне», — звярнулася Наталля Качанава да кіраўніка ЦРБ.

Не горш, чым ва Уфе

У гэты ж дзень Старшыня Савета Рэспублікі наведала Віцебск, дзе сустрэлася з кіраўніцтвам вобласці. Абмяркоўвалася падрыхтоўка да XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які ў 2024 годзе пройдзе ў горадзе на Дзвіне.

«Нам з вамі давядзецца прымаць вялікую колькасць гасцей, прадстаўнікоў з розных рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі. Будуць прадстаўлены практычна ўсе з іх. Таксама будуць удзельнічаць усе рэгіёны нашай краіны. Таму неабходна старанна падумаць, дзе мы правядзём секцыйныя і пленарныя пасяджэнні, наколькі камфортна зможам размясціць гасцей, прадумаць, якія яшчэ могуць быць задзейнічаны аб'екты для размяшчэння ўдзельнікаў форуму. Таксама варта вызначыцца з аб'ектамі харчавання. Гэта асноўныя арганізацыйныя мерапрыемствы, якія павінны ў перыяд падрыхтоўкі знаходзіцца ў плоскасці нашай увагі і мясцовых органаў улады», — адзначыла Качанава.

Сёлета юбілейны форум з размахам сустракала расійская Уфа, таму Віцебску, які ў будучым годзе будзе адзначаць 1050-годдзе, неабходна бліскуча падрыхтавацца.

«У Віцебскай вобласці мы таксама павінны годна правесці гэтае мерапрыемства, каб паказаць увесь патэнцыял нашай краіны. Тым больш што ў гэтага рэгіёна моцна развіты міжрэгіянальныя эканамічныя і пабраціімскія сувязі з Расійскай Федэрацыяй. Дзякуючы «Славянскаму базару» Віцебск носіць званне культурнай сталіцы Беларусі. Усё гэта дазваляе нам разлічваць, што будучае важнае мерапрыемства мы правядзём на высокім узроўні, а таксама прадэманструем гасцям багаты культурны здабытак і традыцыі віцебскай зямлі», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

Наталля Качанава наведала аб'екты, якія стануць пляцоўкамі для правядзення мерапрыемства, пабывала ў тым ліку ў канцэртнай зале «Віцебск», для якой ужо не ў навінку быць адной з цэнтральных сцэнічных пляцовак падобных форумаў. Цяпер у канцэртнай зале ідзе рамонт.

Тэму пляцоўкі, спікераў, якія будуць выступаць на Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, вызначаць на пасяджэнні аргкамітэта, сфарміраваным Саветам Рэспублікі і Саветам Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

СЕНАТАРСКІЯ КЛОПАТЫ

«СВАЮ ДЗЕЙНАСЦЬ НА ПРАФЕСІЙНУЮ І ГРАМАДСКУЮ НЕ ПАДЗЯЛЯЮ...»

ПРАБЛЕМАМІ грамадства начальнік Магілёўскага інстытута МУС генерал-маёр міліцыі Валерый ПАЛІШЧУК займаецца ўсё жыццё. На пасадзе начальніка міліцэйскай установы адукацыі ён апошнія 9 гадоў. А да гэтага прайшоў усе прыступкі сілавога ведамства, пачынаючы ад звычайнага міліцыянера да начальніка ўпраўлення ўнутраных спраў Гомельскага аблвыканкама. За час сваёй работы не адну грамадскую праблему вырашыў. Гэты вопыт яму як члену Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве вельмі спатрэбіўся. Бо яго заўвагі і прапановы, як чалавека, які добра ведае, чым дыхае грамадства, з'яўляюцца вельмі карыснымі пры стварэнні беларускага заканадаўства. З размовы пра гэтую важную місію, уласна, і пачалося наша інтэрв'ю.

— Да разгляду якіх законапраектаў вы прычыніліся асабіста, з улікам вашага багатага прафесійнага досведу? — пацікавілася карэспандэнт «МС» у сенатара.

— Усе беларускія законы сацыяльна арыентаваныя. І калі мы абмяркоўваем тую ці іншую норму, суадносім яе з магчымасцю максімальна лёгка і зручна прымяніць на практыцы. Летась у сферы канстытуцыйнага заканадаўства быў разгледжаны Закон «Аб дзяржаўнай службе», які замацаваў цэласную сістэму дзяржаўнай службы і абнавіў падыходы да прысвоення класаў дзяржаўным грамадзянскім служачым, узмацніў патрабаванні да іх дысцыпліны і адказнасці. Напрыклад, устаноўлена забарона на прыём на грамадзянскую службу асоб, звольненых па любых дыскрэдытацыйных абставінах.

> Заўсёды разумею, што пры сустрэчах з людзьмі вельмі важна не толькі данесці да іх актуальную і запатрабаваную інфармацыю, але і пачуць іх меркаванне па закранутай тэматыцы, асабліва што датычыцца работы Савета Рэспублікі і заканадаўства, якое мы разглядаем.

Змяненні ў беларускім заканадаўстве аб зямлі выклікалі неабходнасць змянення і Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Сёння аптымізуецца парадак выдзялення зямельных участкаў, іх грамадзянскі абарот і ўключэнне ў яго зямель, якія не выкарыстоўваюцца. Тым самым забяспечаны спрыяльныя ўмовы землекарыстання ў рэгіёнах, пашыраны правы землекарыстальнікаў і мясцовых выканаўчых органаў у частцы выдзялення і выкарыстання зямельных участкаў, ажыццяўлення здзелак з імі. У тым ліку нормы гэтага закона дазволілі грамадзянам легалізаваць свае правы на самавольна занятыя зямельныя ўчасткі і вырашыць лёс самавольных пабудоў.

А Закон «Аб сацыяльнай падтрымцы насельніцтва» даў дадатковыя магчымасці органам улады ў пытаннях аказання сацыяльнай падтрымкі асобным катэгорыям грамадзян, аператыўнага прыняцця рашэнняў па пераглядзе бюджэту пражыткавага мінімуму і індэксацыі мінімальнай заработнай платы ва ўмовах увядзення эканамічных і іншых санкцый у дачыненні да нашай краіны і існуючай сусветнай эканамічнай сітуацыі.

Фота Кірыла МАРЖАНАВА.

Многае за гэты перыяд Саветам Рэспублікі зроблена па пашырэнні і ўмацаванні дагаворна-прававой базы міжнароднага супрацоўніцтва — ратыфікаваны шматбаковыя дакументы ў рамках ЕАЭС, СНД, АДКБ і гэтак далей.

— А над якімі законапраектамі вы сёння працуеце?

— Сёння актыўна дапрацоўваецца праект Закона «Аб змяненні кодэксаў», якім удасканальваюцца палажэнні ў тым ліку па падрыхтоўцы праекта адзінага Кодэкса грамадзянскага судаводства, накіраванага на ўніфікацыю грамадзянскага працэсуальнага і гаспадарчага працэсуальнага заканадаўства, забеспячэнне аднастайнага падыходу да інстытута перагляду судовых пастаноў у судаводстве.

Прайшло паўтара года з моманту прымянення рэспубліканскага рэферэндуму. На працягу гэтага тэрміну мы паспяхова адаптаваліся ў прававым полі абноўленай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. На сесіі Савета Рэспублікі, якая пачалася 19 верасня, фактычна завяршым прывядзенне законаў у адпаведнасць са змяненнямі і дапаўненнямі Канстытуцыі, разгледзім шэраг праектаў законаў, якія выключна важныя для нашай краіны.

— Што лічыце галоўным у вашай рабоце з насельніцтвам? З якімі праблемамі звяртаюцца жыхары вашых «падшэфных» раёнаў? Што ў сілах сенатара зрабіць для вырашэння асобных жыццёвых пытанняў?

— Штомесяц праводжу сустрэчы з насельніцтвам Горацкага, Мсціслаўскага і Дрыбінскага раёнаў. На сустрэчах абмяркоўваем актуальную палітычную сітуацыю, новаўвядзенні ў заканадаўчай сістэме. У гэтых жа раёнах вяду прыём грамадзян. Людзі прыходзяць са сваімі самымі патаемнымі пытаннямі, і я не магу іх падвесці. Заўсёды стараюся даць добрую параду, аказаць дапамогу ў вырашэнні сітуацыі. Многія не могуць падзяліць спадчыну, самастойна вырашыць праблемы з працаўладкаваннем або набыццём зямельнага ўчастка. Калі пытанне простае, вырашаем яго на працягу дня, больш складаныя стаўлю на кантроль.

Заўсёды разумею, што пры сустрэчах з людзьмі вельмі важна не толькі данесці да іх актуальную і запатрабаваную інфармацыю, але і пачуць іх меркаванне па закранутай тэматыцы, асабліва што датычыцца работы Савета Рэспублікі і заканадаўства, якое мы разглядаем. Я ўпэўнены, што зносіны могуць лічыцца эфектыўнымі толькі тады, калі агучаныя ідэі і прапановы прапрацаваны і ўлічаны падчас прыняцця рашэнняў, значных для людзей, якія звярнуліся.

Таксама сумесна з курсантамі і супрацоўнікамі Магілёўскага інстытута МУС ажыццяўляем шэфства, праводзім дабрачынныя праекты ў аддзяленні кругласутачнага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў у аграгарадку Пудаўня Дрыбінскага раёна, аказваем дапамогу ў добраўпарадкаванні тэрыторыі і набыцці неабходных тавараў для аддзялення кругласутачнага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту і інвалідаў, якое знаходзіцца ў вёсцы Андраны Мсціслаўскага раёна.

Мы традыцыйна ўдзяляем увагу не толькі пажылым людзям, але і шматдзетным сям'ям, дзецям з цэнтраў рэабілітацыі. Наведваем з дабрачыннай місіяй Мацюцкі дзіцячы сад Горацкага раёна, шматдзетныя сем'і ў Магілёўскай вобласці, Мсціслаўскую школу-інтэрнат, Цэнтр рэабілітацыі ў Магілёве.

У мінулым годзе сумесна са старшынямі райвыканкамаў Дрыбінскага і Мсціслаўскага раёнаў арганізавалі спартыўна-турыстычную спартакіяду, прысвечаную Дню ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа. У ёй прымалі ўдзел каманды курсантаў Магілёўскага інстытута МУС і моладзі названых раёнаў.

Спартакіяды аб'ядноўваюць маладых і перспектыўных хлопцаў і дзяўчат, якія настроены на поспех. Згуртаванасць і стойкасць, хуткасць і сіла, майстэрства і воля — вось галоўныя складнікі поспеху!

— Грамадская дзейнасць для прававахоўніка і сенатара — справа агульная. І ўсё ж такі, наколькі складана сумяшчаць абавязкі кіраўніка сур'ёзнай ВНУ з сенатарскай місіяй?

— У нас у інстытуце ёсць такая практыка: кожны месяц праводзім адзіныя дні інфармавання, і я, асабліва калі ўступная кампанія, павінен аб'ехаць шматлікія навучальныя ўстановы, расказаць і зацікавіць патэнцыяльных курсантаў. Калі я стаў сенатарам, цяжкасцяў у плане выступленняў недзе ў калектывах у мяне не было. Наадварот, я выязджаю з задавальненнем, таму што зносіны з людзьмі і мяне ў нейкіх пытаннях развіваюць і нацэльваюць.

Вядома, складана весці актыўную грамадскую дзейнасць і забяспечваць выкананне на належным узроўні задач па ўдасканаленні адукацыйнага і выхаваўчага працэсу. Але ўсё атрымліваецца, калі ты не лічышся з асабістым часам, працуеш з энтузіязмам і адказна, перажываеш за вынік, і ў цябе ў камандзе аднадумцы з такім жа разуменнем і падыходам у працы і службе. Цяпер Магілёўскі інстытут МУС дынамічна развіваецца і выпускае дастойных маладых афіцэраў.

— Сёння ў свеце вельмі складаная міжнародная палітычная абстаноўка. Як беларускі парламент рэагуе на агрэсіўныя выпадкі недружалюбных краін?

— Мы своечасова адбівалі ідэалагічныя правакацыі нашых непрыяцеляў, якія спрабуюць пазіцыянаваць нашу краіну ў якасці агрэсара. Так, напрыклад, гэта было ў адносінах да ўнесенага ў 2022 годзе ў Сенат Кангрэса ЗША праекта чарговай рэзалюцыі па Беларусі, у якой на аснове адкрытых фэйкаў і дэзынфармацыі рабіліся бяздоказныя абвінавачанні. Тады Прэзідыум Савета Рэспублікі адрэагаваў публічным асуджэннем з заклікам да амерыканскіх заканадаўцаў засяродзіцца на вырашэнні праблем свайго народа.

І мы ў гэтай пазіцыі не адны. Геапалітычная рэальнасць сведчыць аб актыўным фарміраванні пояса краін і міжнародных арганізацый, якія маральна гатовы супрацьпаставіць аднапалярнаму свету шматпалярны, заснаваны на моцных нацыянальных дзяржавах. Гэта краіны «далёкай дугі», з якімі ў Беларусі склаліся добрыя дружалюбныя адносіны.

> Прайшло паўтара года з моманту прымянення рэспубліканскага рэферэндуму. На працягу гэтага тэрміну мы паспяхова адаптаваліся ў прававым полі абноўленай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. На сесіі Савета Рэспублікі, якая пачалася 19 верасня, фактычна завершым прывядзенне законаў у адпаведнасць са змяненнямі і дапаўненнямі Канстытуцыі, разгледзім шэраг праектаў законаў, якія выключна важныя для нашай краіны.

Кажучы аб прымаемых мерах па рэагаванні на патэнцыяльныя пагрозы нацыянальнай бяспецы і суверэнітэту нашай краіны, мы зыходзім з вядомага пасылу: «Хочаш міру — рыхтуйся да вайны...». Так, для павышэння эфектыўнасці выканання ўнутранымі войскамі МУС ускладзеных на іх функцый намі былі адобраны палажэнні Закона «Аб змяненні законаў па пытаннях дзейнасці ўнутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў». У прыватнасці, замацаваны паўнамоцтвы ваеннаслужачых унутраных войскаў на прымяненне баявой і спецыяльнай тэхнікі для спынення масавых беспарадкаў і групавых парушэнняў грамадскага парадку і па іх удзеле ў падтрыманні прававога рэжыму ў зоне правядзення контртэрарыстычных аперацый.

Асобна спынюся на ролі Закона Рэспублікі Беларусь «Аб народным апалчэнні» ў забеспячэнні нацыянальнай бяспекі нашай краіны. Прыняцце гэтага закона было абумоўлена наступнымі фактарамі: па-першае, стварэнне дадатковых умоў для падтрымання правапарадку ў перыяд ваеннага становішча на тэрыторыях, якія менш за ўсё будуць ахоплены органамі ўнутраных спраў і войскамі. Гэта перш за ўсё сельскія населеныя пункты і асобныя раённыя гарады. Па-другое, прадастаўленне грамадзянам Рэспублікі Беларусь, якія не будуць ахоплены мабілізацыйнымі мерапрыемствамі на розных прычынах, магчымасці ўдзельнічаць у абароне краіны. Такімі прычынамі могуць стаць узрост, адсутнасць патрабаванай падрыхтоўкі па сямейных абставінах. У маім уяўленні сапраўдны мужчына не павінен баяцца, што яго прызавуць. А сам прапаноўваць сваю кандыдатуру для абароны Радзімы і сям'і. Абарона беларускай дзяржавы можа мець усенародны характар, гэта ўнутраная ідэалогія кожнага грамадзяніна нашай краіны.

Таксама ўзмоцнены меры пакарання да арганізатараў і выканаўцаў тэрарыстычных актаў. Адобраны ў сферы заканадаўства аб крымінальнай адказнасці Закон «Аб змяненні Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь» сёння прадугледжвае магчымасць прымянення выключнай меры пакарання за замах на ўчыненне актаў тэрарызму. Гэта заканадаўчае рашэнне з'яўляецца дадатковай мерай прэвентыўнага ўздзеяння і адэкватным адказам на існуючыя тэрарыстычныя пагрозы.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ПАМЯЦЬ

СЕЛЬСАВЕТ ДАПАМОГ УВЕКАВЕЧЫЦЬ ІМЯ

Калі гаворка ідзе пра адраджэнне памяці, сельскія Саветы дэпутатаў таксама ў баку не застаюцца. Гэтыя ўстановы працуюць непасрэдна з людзьмі і акумулююць усю карысную мясцовую інфармацыю, у тым ліку часоў Вялікай Айчыннай вайны. Такая работа яшчэ больш актывізавалася, калі пачалося даследаванне фактаў генацыду ў гады вайны.

Пахаванне часоў Вялікай Айчыннай вайны, якое знаходзіцца ў лесе непадалёк ад вёскі Вазраждзенне, пэўны час даглядалі мясцовыя жыхары. Хто там пахаваны, дакладна яны не ведалі. Пасля таго як інфармацыю ўзяў на заметку сельсавет, атрымалася часткова аднавіць падзеі далёкіх гадоў. Сёлета на магіле замест сціплай абязлічанай пірамідкі з'явіўся гранітны помнік з аграждай, а вакол магілы была пакладзена плітка. Гэтыя работы за бюджэтныя грошы зрабіў Семукацкі сельсавет.

— Пачалося ўсё з таго, што дачніца прыгадала пачутую ў дзяцінстве ад суседкі гісторыю пра пахаванага ў лесе партызана, — удакладняе **старшыня Семукацкага сельсавета Тамара УКРУЖСКАЯ.** — Апошнім часам магіла была ў заняпадзе. Мы пра яе нават не ведалі, бо яна знаходзіцца ў цяжкадаступным месцы ў лесе. Пасля таго як мы пра гэта даведаліся, інфармацыя была праверана праз архіў і сапраўды пацвердзілася. У кнізе «Памяць» Магілёўскага раёна мы адшукалі артыкул пра дзейнасць на нашай тэрыторыі 600-га атрада Асмана Касаева. Там жа згадваецца імя аднаго з партызанаў, які загінуў у баі. Гэта Іван Платонавіч Клішкоў, якому на той момант было ўсяго 17 гадоў. Менавіта ён і пахаваны ў лясной магіле. Імя другога героя пакуль застаецца невядомым, але мы яшчэ

высвятляем падрабязнасці. Абодва ваявалі ў атрадзе Асмана Касаева і загінулі ў 1943 годзе, калі пайшлі ў разведку. Пахаванне пастаўлена на ўлік як воінскае і акультурана.

Дарэчы, сёлета на тэрыторыі Семукацкага сельсавета абазначана яшчэ адно раней не ўлічанае пахаванне часоў Вялікай Айчыннай

вайны. Яно знаходзіцца каля вёскі Коркаць. На жаль, імя воіна аднавіць не атрымалася.

— Са слоў ураджэнкі вёскі Людмілы Кануннікавай, калі непадалёк ад іх паселішча ішлі вызваленчыя баі, чырвонаармейцы прынеслі байца, — расказвае старшыня сельсавета. — Ён быў цяжка паранены і памёр у дарозе. Таварышы загарнулі яго ў шынель і прыкапалі на ўскрайку могілак. Абяцалі, што вернуцца і пахаваюць яго як мае быць. Але ніхто з таго цяжкага бою не вярнуўся, так што даведацца імя байца не атрымалася. Жыхары пахавалі яго як невядомага. Гэтае пахаванне таксама пастаўлена на ўлік як воінскае. Налета на ім будзе ўстаноўлены помнік.

Па словах **начальніка аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Магілёўскага райвыканкама Алесі КУПЦОВАЙ,** у раёне праводзіцца вялікая работа па ўшанаванні памяці загінулых пры абароне Айчыны грамадзян. У рамках садзейнічання ў расследаванні крымінальнай справы па факце генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны сёлета ў раёне на дзяржаўны ўлік пастаўлены сем раней не ўлічаных воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр вайны (летась — 15). Усяго на тэрыторыі раёна на ўлік знаходзяцца 158 воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр вайны.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Фота з архіва Семукацкага сельсавета.

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

ЧЭЛЕНДЖ ПА-СУСЕДСКУ

Прадстаўнікі Воранаўскага і Гродзенскага раёнаў абмяняліся вопытам работы падчас выязнога семінара

Такая практыка сёння даволі распаўсюджаная. Сапраўды, чаму не скарыстацца тым, што ўжо напрацавана і мае пэўны вынік. Вось і госці з Воранава завіталі ў Гродзенскі раён, каб паглядзець, як працуе мясцовае самакіраванне ў адным з перадавых раёнаў краіны.

Як правіла, акцэнт у такога кшталту сустрэчах робіцца на добраўпарадкаванне тэрыторый, а таксама знаёмства з цікавымі формамі работы з насельніцтвам.

— Выязныя семінары-практыкумы сталі традыцыйнымі ў рабоце дэпутацкага корпуса, — адзначыла **старшыня Воранаўскага раённага Савета дэпутатаў Алена ГАНЕВІЧ.** — Мы можам убачыць, якія метады выкарыстоўваюць нашы суседзі, каб арганізаваць работу на месцах. Кірункі самыя розныя. Гэта і гісторыка-культурная спадчына, і навядзенне парадку на зямлі, і работа з пустымі аб'ектамі, і знаёмства з грамадзянскімі ініцыятывамі. Мы ведаем, што Гродзенскі раён мае вялікі досвед у ажыццяўленні такіх праектаў.

Дарэчы, Воранаўскі раён сёлета прадставіў на абласны конкурс заяўку па добраўпарадкаванні парку ў аграгарадку Пагародна. Тут захаваліся элементы паркавай зоны XVIII стагоддзя, што робіць яго гісторыка-культурнай каштоўнасцю. Але гэтая зона патрабуе значных фінансавых укладанняў, каб набыць належны выгляд. Таму зацікаўленыя госці пазнаёміліся з асартыментам дэндрарыя Скідзельскага лясгаса. Расліны, якія тут прадстаўлены, могуць упрыгожыць любую паркавую зону, лічаць госці з Воранаўскага раёна.

Фота Мікалая ПАПІНА.

Дарэчы, месцы адпачынку сталі важнымі пунктамі маршруту выязнога турнэ па Гродзенскім раёне. Напрыклад, у аграгарадку Адэльск госці наведалі цэнтральны парк, дзе праходзяць многія святы, у тым ліку брэндавы «Адэльскі фэст» у гонар ахоўніка аграгарадка Святога Антонія. Дарэчы, многія работы па добраўпарадкаванні парку спансіраваныя бізнесменам, які адсюль родам. Аб гэтым гасцям расказаў **старшыня Адэльскага сельвыканкама Уладзімір ТРУТНЕЎ.** Ён заўважыў, што мясцовыя жыхары падтрымліваюць парадак, садзяць дрэвы, кветнікі. Дарэчы, парадак тут заахвочваецца і сярод гаспадароў сядзіб. Самыя дбайныя атрымліваюць прэміі і прызы падчас сельскіх конкурсаў.

Ёсць у Адэльску і свая славутасць. Гэта Мар'ян Скрамблевіч, слава якога даўно перайшла межы аграгарадка. Вядомы народны майстар Беларусі, музыкант, ён стварае ўнікальныя народныя інструменты: дудачкі, флейты, акарыны, валынкі, трэмбіты, трашчоткі, бубны з розных парод дрэў. Яго музей налічвае больш за сотню інструментаў, а творчасць майстра ўнесена ў спіс гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Нядаўна Мар'ян Скрамблевіч быў удастоены медаля Францыска Скарыны. У раёне папулярызуюць творчасць знакамітага земляка, бо такія людзі сваім талентам ствараюць імідж тэрыторыі, дзе пражываюць, становяцца прыкладам у захаванні яе традыцый і самабытнасці. Зразумела, што многія турысты імкнуцца наведаць гэты музей і пазнаёміцца з такім унікальным майстрам. І хоць музыканту ўжо за 80, ён гатовы прыняць усіх і прадэманстраваць свае інструменты.

— Такія ўнікальныя асобы заўсёды цікавяць людзей, яны прыцягваюць турыстаў сваёй энергетыкай, таму вельмі важна як мага больш распаўсюджваць такую творчасць, — лічыць **старшыня Радунскага сельвыканкама Андрэй ШЫНКОВІЧ.**

У сувязі з апошнім ён прыгадаў знакамітага яўрэйскага праведніка Хафеца Хаіма, які жыў у Радуні і пахаваны там. Каб ушанаваць яго памяць, сюды прыязджаюць турысты з усіх краін свету. Кожны рабін лічыць сваім абавязкам пабываць на месцы пахавання чалавека, які стварыў цэлае вучэнне. Гэты аб'ект стаў часткай турыстычнага маршруту Воранаўскага раёна. Магчыма, з цягам часу будзе магчымасць стварыць тут адпаведны музей. Дарэчы, тэма вясковых музеяў атрымала новы імпульс.

— Сёння важна даць жыццё пустым дамам. Таму мы зацікавіліся вопытам стварэння сельскіх музеяў, у прыватнасці дамоў сельскага быту. Першымі ў вобласці такія дамы-музеі былі арганізаваны ў Зэльвенскім раёне, — звярнула ўвагу старшыня Воранаўскага райсавета Алена Ганевіч. — Цяпер ідзе абмеркаванне ўтрымання аднаго з такіх пустых дамоў у вёсцы Нача, дзе жывуць актыўныя жанчыны, гатовыя навучыць бытавым танцам, праспяваць старыя абрадавыя песні, увогуле гасцінна сустрэць усіх наведвальнікаў.

Воранаўцы таксама паглядзелі на азеляненне тэрыторый Гродзенскага раёна. Менавіта гэты напрамак выклікаў у гасцей найбольшую цікавасць, асабліва пасля наведвання аграгарадка Абухава, дзе **старшыня сельвыканкама Валерый СМАЛЕЙ** не толькі паказаў знакавыя аб'екты сацыяльнай інфраструктуры, але і пазнаёміў з мясцовымі жыхарамі. Руплівыя гаспадары клапоцяцца пра добраўпарадкаванне свайго населенага пункта, а мясцовая ўлада такія ініцыятывы заахвочвае.

— У нас няма забароны на добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый і двароў. Тут кожны можа прыкласці сваю фантазію, — пачаў расказваць Валерый Смалей. — Такіх ініцыятыўных людзей у аграгарадку нямала. Яны самі бяруцца за справу, ствараюць прыгажосць. Бывае, што гэта даволі складана, бо некаторыя носяць ваду з трэцяга паверха свайго дома, каб паліць клумбу. У сваю чаргу, мы дапамагаем ім вывезці расліннае смецце і кампастуем яго. Праводзім розныя агляды-конкурсы прыдамовых тэрыторый і сядзіб, заахвочваем нашых творчых грамадзян.

Па словах старшыні Воранаўскага райсавета Алены Ганевіч, пытанні ландшафтнага азеляненя тэрыторый не толькі не губляюць сваёй актуальнасці, але і наадварот — набываюць усё большы размах. Прычым гаворка ідзе пра нестандартны падыход да справы. У сувязі з гэтым у раёне праходзяць выязныя семінары, дзе старшыні сельвыканкамаў якраз дэманструюць работу па дадзеным кірунку. Што датычыцца выязного семінара, ён карысны ў плане набыцця новага вопыту, які можна скарыстаць у сваім раёне, у прыватнасці ў плане работы з насельніцтвам. І тут у гродзенцаў ёсць галоўны прынцып — растлумачыць людзям важнасць такога падыходу.

— Мы праводзім значную тлумачальную работу з жыхарамі населеных пунктаў, гаворым аб важнасці добраўпарадкавання сваёй малой радзімы. Таму што прымушаць у такой справе нельга. Усё павінна ісці ад душы, ад сэрца. Тады родны куток будзе яшчэ прыгажэйшы, — упэўнены **старшыня Гродзенскага райвыканкама Ігар ЛЯБЕЦКІ.**

У рамках семінара госці наведалі Індурскі сельскі Савет, дзе пазнаёміліся з арганізацыяй адпачынку на мясцовым возеры, ацанілі якасць новай спартыўнай пляцоўкі, якая была ўрачыста адкрытая на мінулым тыдні. Яшчэ пабывалі ў Луцкаўлянскай СШ і даведаліся, як пастаўлена працоўнае выхаванне вучняў.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 10.387. Нумар падпісаны ў 19.30 19 верасня 2023 года.

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Гроднохлебпром»

Аукцион состоится 11.10.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71

Лот № 1	
Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона	ЛОТ 1: - капитальное строение, инв. № 410/С-12464 (назначение – здание многофункциональное 2 29 25, наименование – многофункциональное здание), общей площадью 69,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Волковыск, ул. Школьная, 16; - капитальное строение, инв. № 410/С-19981 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства 3 10 00, наименование – водопровод), протяженностью 23,0 м, расположенное по адресу: г. Волковыск, ул. Школьная, 16; - капитальное строение, инв. № 410/С-19986 (назначение – сооружение специализированное энергетики 3 08 00, наименование – газопровод), протяженностью 10,0 м, расположенное по адресу: г. Волковыск, ул. Школьная, 16; - капитальное строение, инв. № 410/С-19988 (назначение – сооружение неустановленного назначения 3 99 99, наименование – мощение), общей площадью 177,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Волковыск, ул. Школьная, 16/1; - капитальное строение, инв. № 410/С-19983 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства 3 10 00, наименование – канализация), протяженностью 14,9 м, расположенное по адресу: г. Волковыск, ул. Школьная, 16; - устройство молниеотвода. Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 420850100001001674, площадью 0,0763 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли 1 16 03), находящемся по адресу: г. Волковыск, ул. Школьная, 16. Условия аукциона: - оплата должна быть внесена в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты заключения договора; - расходы, связанные с государственной регистрацией сделки, несет Покупатель; - возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по оказанию услуг по независимой оценке в размере 679,80 руб.; - возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору торгов в размере 5 % от конечной цены продажи
Начальная цена продажи	74 881,97 р. (семьдесят четыре тысячи восемьсот восемьдесят один рубль девяносто семь копеек) с учетом НДС
Сумма задатка	7 488 р. (семь тысяч четыреста восемьдесят восемь рублей)
Реквизиты для перечисления задатка	BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Место, дата и время окончания приема заявлений	Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – 09.10.2023 г. до 15.00
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 05.08.2023 г.	
Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony	

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ЮРИДИЧЕСКОГО ЛИЦА, НАХОДЯЩЕГОСЯ В ПРОЦЕССЕ ЛИКВИДАЦИИ

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2023.Ч.002.00089** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY по адресу: https://etpvit.by

Продавец: ООО «БешЛесИнвест», 211361, Витебская область, г. п. Бешенковичи, ул. Черняховского, д. 1В, тел. +37533 389 97 89.

Организатор, Оператор электронной торговой площадке ETPVIT.BY: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

Дата и время проведения торгов – 23 октября 2023 г. в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

Лот 1. Кромкообрезной станок ГР-500, инв. № 001, 2018 г. в.
Нач. цена: 4100,00 бел. руб. без учета НДС.
Задаток: 410,00 бел. руб.

Лот 2. Горизонтальная ленточная пилорама G450s, инв. № 014, 2016 г. в.
Нач. цена: 7000,00 бел. руб. без учета НДС.
Задаток: 700,00 бел. руб.

Лот 3. Горизонтальная ленточная пилорама G450s, инв. № 015, 2016 г. в.
Нач. цена: 7000,00 бел. руб. без учета НДС.
Задаток: 700,00 бел. руб.

Лот № 4. Заточный станок ОРТ-10, инв. № 018, 2016 г. в.
Нач. цена: 5900,00 бел. руб. без учета НДС.
Задаток 590,00 бел. руб.

Лот № 5. Установка компрессорная СБ4/Ф-500 LB75, инв. № 019, 2017 г. в.
Нач. цена: 2400,00 бел. руб. без учета НДС.
Задаток: 240,00 бел. руб.

Лот № 6. Дисковый обрезной станок TR-800, инв. № 020, 2002 г. в.
Нач. цена: 12700,00 бел. руб. без учета НДС.
Задаток: 1270,00 бел. руб.

Лоты №№ 1–6 находятся по адресу: Витебская обл., г. п. Бешенковичи, ул. Черняховского, д. 1В.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением «О порядке проведения электронных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами по электронным торгам: до 16.00 20.10.2023.

Сумма задатка по электронным торгам перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Шаг электронных торгов – 5 % от начальной цены лота.

Условия электронных торгов: Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 раб. дней после утверждения протокола эл. торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, расходы Продавца на проведение независимой оценки, и оплатить услуги оператора ЭТП; в течение 10 раб.дней со дня утверждения протокола эл. торгов и после возмещения затрат на организацию и проведение эл. торгов, расходов на проведение независимой оценки, услуг оператора ЭТП подписать договор купли-продажи предмета эл. торгов; оплатить предмет эл. торгов в сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета эл. торгов; демонтаж и вывоз оборудования осуществляются за счет покупателя согласно договору купли-продажи. Расходы Продавца на проведение оценки по каждому лоту составляют 112,75 бел. руб. с учетом НДС. С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by в разделе «Станки и оборудование». Имущество бывшее в употреблении. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по месту нахождения имущества по предварительному согласованию с Продавцом: Вайчайтене Наталия Петровна, конт. тел.: +375 33 389-97-89, +375 29 218-48-56.

ЗАО «БелБанкротАукцион», организатор торгов по продаже имущества **ООО «БИПТ Регион»** (УНП 490942667), объявляет о проведении **02.10.2023 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: bankrottorg.by

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Вилейский райагросервис»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Капитальное строение с инв. № 631/С-67657 (назначение – Здание специализированное культурно-просветительного и (или)зрелищного назначения, наименование – Клуб Талуть, общая площадь – 308,7 кв. м, составные части и принадлежности: А1-2/д-Клуб Талуть)	17 280,00	1 728,00	864,00
2	Ванна 500 л, инв. 6018	162,00	16,20	8,10
3	Ванна 500 л, инв. 6019	162,00	16,20	8,10
4	Центрифуга лабораторная «Орбита»	140,40	14,04	7,02
5	Станок фрезерный ЕС71035, инв. 6040	1584,00	158,40	79,20
6	Бункер зерновой б/у, инв. 1391-О	2286,00	228,60	114,30
7	Стенд КИ-4200 ШИЛ., инв. 744	360,00	36,00	18,00
8	Стенд топлив. «материал», инв. 862	612,00	61,20	30,60
9	К-701 (раз) Шиловичи, инв. № 6047	8064,00	806,40	403,20
10	Стойки опорные Осип 1,3 т, инв. № 6049	1008,00	100,80	50,40
11	Стеллаж, инв. № 6052; Стеллаж, инв. № 6051; Стеллаж, инв. № 6050	172,80	17,28	8,64
12	Стол-верстак, инв. № 6053; Стол-верстак, инв. № 6054; Стол-верстак (двойной), инв. № 6055	330,48	33,05	16,52
Лот	**Наименование**	**Начальная цена с учетом НДС 10 %, бел. руб.**	**Задаток, бел. руб.**	**Шаг аукциона, бел. руб.**
13	Пчелосемья с ульем в количестве 19 шт.	486,20	48,62	24,31

В отношении лота № 1 проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 149 (30029) от 04.08.2023, стр. 15.
В отношении лотов №№ 2–8 проводятся шестые повторные торги. **Стоимость снижена на 85 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 69 (29949) от 12.04.2023, стр. 14, № 97 (29977) от 24.05.2023, стр. 14, № 114 (29994) от 16.06.2023, стр. 14, № 137 (30017) от 19.07.2023, стр.11, № 149 (30029) от 04.08.2023, стр. 15, № 164 (30044) от 25.08.2023, стр. 15.
В отношении лотов №№ 9–12 проводятся третьи повторные торги. **Стоимость снижена на 40 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 137 (30017) от 19.07.2023, стр. 11, № 149 (30029) от 04.08.2023, стр. 15, № 164 (30044) от 25.08.2023, стр. 15.
В отношении лота № 13 проводятся четвертые повторные торги. **Стоимость снижена на 80 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 69 (29949) от 12.04.2023, стр. 14, № 137 (30017) от 19.07.2023, стр. 11, № 149 (30029) от 04.08.2023, стр. 15, № 164 (30044) от 25.08.2023, стр. 15

Местонахождение лота № 1: Минская обл., Вилейский р-н, Любанский с/с, д. Талуть, ул. Центральная, 2А. Местонахождение лотов №№ 2–13: Минская обл., Вилейский р-н

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 62138461460100058, площадью 0,192 га, назначение – Земельный участок для размещения объектов культурно-просветительного и зрелищного назначения (для строительства и обслуживания здания клуба). Право аренды

Дата и время проведения торгов	**4 октября 2023 года в 12.00 (регистрация – с 11.30 до 11.55)**
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	**с 10.00 20 сентября 2023 года до 16.00 2 октября 2023 года**

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ОАО «Вилейский райагросервис», проводимых 04.10.2023.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления являются дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. По вопросу осмотра объектов обращаться по телефонам: **+375299999112, Чеслав (по лотам №№ 1–12), +375297518464, Михаил Алексеевич (по лоту № 13).**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности (при необходимости). Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

Информация о продавце	**ОАО «Вилейский райагросервис» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375172552928 (222416, г. Вилейка, ул. 1 Мая, 105, УНП 600010756)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

Информация о проведении открытого аукциона **20 октября 2023 г.** по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов **в дер. Каменка, Высокое, Новодворье, Сарнацкое**

Организатор аукциона: Усяжский сельский исполнительный комитет, 222212, пос. Усяж, ул. Комсомольская, д. 10.

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь, (га)	Целевое назначение	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)
1	дер. Каменка, ул. Дачная (объект № 13/2021)	624885603101000208	0,15	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	20 000,00
2	дер. Высокое ул. Широкая, 2А (объект № 57/2022)	624885601501000149	0,11	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	20 000,00
3	дер. Новодворье, ул. Центральная (объект № 99/2021)	624885605101000122	0,15	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	15 000,00
4	дер. Сарнацкое (объект № 20/2020)	624885606101000027	0,0819	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	10 000,00

Аукцион состоится 20 октября 2023 г. в 11.00 в Усяжском сельском исполнительном комитете по адресу: ***пос. Усяж, ул. Комсомольская, д. 10***, кабинет председателя.

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/, Смолевичского райисполкома: isp@smolevichi.gov.by, на сайте Минского областного исполнительного комитета.

УНП 600023836

ОАО «Минскгрузавтотранс»

извещает своих акционеров о проведении 06 октября 2023 года внеочередного собрания акционеров

Повестка дня

1. Об утверждении договора о присоединении открытого акционерного общества «Минскгрузавтотранс» к открытому акционерному обществу «Автосила».

Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 2 (2-й этаж, к. 11). Начало собрания – в 14.00.

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества (г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 2, комн. 11) в рабочие дни в период с 22 сентября по 06 октября 2023 года с 08.30 до 12.30, а в день проведения собрания – в помещении, где оно проводится.

Регистрация участников собрания будет проводиться с 13.00 до 13.45 день и по месту проведения собрания – по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а для представителя акционера – также и по доверенности или на основании договора.

Список акционеров Общества, имеющих право на участие в собрании, составлен на основании данных реестра акционеров по состоянию на 01 октября 2023 года.

Справки по тел.: (8-017) 226-24-09, 226-24-27.

УНП 100028545 ***Наблюдательный совет ОАО «Минскгрузавтотранс».***

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Карысна ведаць

І зноў рыбін тлушч

У чым яго карысць, і як выбраць эфектыўныя капсулы?

Кожны год навукоўцы знаходзяць новую суперсілу амегі. Яна і сэрцу падмога — зніжае рызыку сардэчнага прыступу, — і мозг абараняе ад старэння, і вочы ўвільгатняе, захоўваючы зрок. Увогуле, без амегі ніяк, але адкуль менавіта яе ўзяць? Прылаўкі аптэк і супермаркетаў завалены пачкамі капсул, і ўсе яны нятанныя. Якія надпісы на ўпакоўках падкажуць, што амега-3 усярэдзіне эфектыўная і прыгатаваная з пазекалагічнаму чыстай рыбы? А можа, можна абысціся без аптэчных пілюль?

Фарэль разрэзаць, прыбраць косткі і падзяліць на кавалачкі вагой роўна 33 грамы кожны. І гэта не кулінарны рэцэпт, а медыцынскі. Бо дарасламу чалавеку трэба прыкладна 33 грамы. Гэта сутачная норма кіслаты амега-3. І каштоўнае рэчыва ёсць не толькі ў дарагой фарэлі, а яшчэ ў значна больш бюджэтных скумбрыі, сардзінах, селядцы. Зрэшты, у апошнім — самая вялікая яе канцэнтрацыя.

Але статыстыка спажывання рыбы ўсё роўна ў нас вельмі прэсная. Ахвоту гатаваць рыбу адбівае тое, што яе трэба скрэбці і патрашыць. А калі купляць гатовае да абсмажвання філе, то цана часта вышэйшая, чым на кураціну, свініну і ялавічыну. У выніку дэфіцыт амегі б'е па здароўі.

Зрэшты, каштоўных кіслот часам не хапае і тым, у каго морапрадукты — абавязковы пункт меню. Бо рыбы, як і людзі, амегу не выпрацоўваюць, а атрымліваюць з ежай. Ласосі сілкуюцца рачкамі, багавіннем, малюскамі — састаў гэтага набору залежыць ад раёна, сезона, глыбіні. Увогуле, нават у дзвюх рыбін з адной зграі колькасць кіслот можа не супадаць. І ўжо тым больш яно рознае ў ласосяў розных парод.

І тлушчу ў іх таксама розная колькасць. Напрыклад, праз рысты булён з тлустымі бурбалкамі на паверхні атрымліваецца з сёмгі, а з гарбушы — жаўтлявы і дыетычны. А яшчэ бывае аквакультурная рыба, якую вырошчваюць на плывучых фермах, і колькі ў філе назапасілася амегі — залежыць ад саставу камбікорму.

Увогуле, у падліках нормы амегі тонуць нават спецыялісты. Часам здаецца, што прасцей купіць гатовыя вітаміны з гэтымі амінакіслотамі. Падрабязнасці вытворчасці амегі, гледзячы на ўпакоўку і чытаючы састаў, спазнаць нельга. Але важныя падказкі ёсць. Значкі ХАССП і GMP гарантуюць, што вытворчасць адладжана па строгіх міжнародных санітарных стандартах. Ёсць і адмысловая маркіроўка «Халяль», якая паказвае на вытворчую чысціню, а яшчэ на тое, што абалонку капсул прыгатавалі не са свінога жэлаціну. І ўсе гэтыя сертыфікаты трэба рэгулярна пацвярджаць.

Але крыніцай амегі можа быць не толькі рыба ці БАДы з яе. Вытворцы шматлікіх соусаў і алеяў акцэнтуюць, што іх тавар таксама амегакарысны. У нерафінаваным ільняным алеі сапраўды шмат амега-3. Вось толькі раслінная амега-3, расчароўваюць урачы, іншая.

А, акрамя амега-3, ёсць яшчэ два сямействы кіслот: амега-6 і амега-9. Іх таксама ярка прэзентуюць на этыкетках біядабавак і маянэзаў. Толькі вось дэфіцыту амега-6 і амега-9 у нас няма! Амега-9 арганізм выпрацоўвае сам, няма ні найменшай патрэбы дадаткова яе прымаць. А амега-6 ёсць у самых будзённых прадуктах: хлебе, кураціне, любым раслінным алеі.

Таму ў многіх з нас ёсць лішак шостай амегі. Мы ўжываем яе занадта шмат — недзе ў чатыры-пяць разоў болей. Між тым перадазіроўка гэтых кіслот звужае сасуды і забівае іх тромбамі. А лепшы антыдот ад шкоднай дозы амега-6 — усё той жа рыбін ці рыбны тлушч. На ўпакоўках пішуць па-рознаму. І ўсе артыкулы пра амегу пачынаюцца з таго, што гэтая розніца прынцыповая. Маўляў, пісаць «рыбін» могуць толькі тыя, хто фасуюць тлушч, атрыманы з печані ў асноўным траскі — у ім больш вітамінаў A і D, а амегі-3 пameней. А «рыбны» — які робяць з мышцаў ці галоў, якія амегай якраз багатыя. Але праўда ў тым, што законам такая тэрміналогія не замацавана і ні да чога не абавязвае. Адны вытворцы яе прытрымліваюцца, а іншыя могуць пісаць на ўпакоўках любое з гэтых слоў, якое прыцягвае больш пакупнікоў.

Псіхалогія для ўсіх

НЕ ДАЙЦЕ СТРАХУ ПЕРАМАГЧЫ ВАС

Усе мы, пачынаючы з дзяцінства, аказваемся літаральна прасякнутымі самымі рознымі страхамі. Іх ініцыіруюць бацькі, сябры, настаўнікі — наша найбліжэйшае асяроддзе. А з часам і сам чалавек, гэтага не ўсведамляючы, пачынае баяцца ледзь ці не кожнага свайго рашэння і зробленага кроку.

У МОЦНЫХ ЦІСКАХ

Як тлумачыць **псіхолаг Мінскага гарадскога цэнтра псіхіятрыі і псіхатэрапіі Мая АЛЯКСЕЕВА,** наяўнасць страхаў — з'ява дастаткова натуральная. Але пачуццё страху мае над чалавекам такую моцную ўладу, што можа стаць як рухавіком яго развіцця, так і, наадварот, паралізаваць на шляху дасягнення мэты. І зразумець, сустрэцца твар у твар са сваімі страхамі — вялікі і сур'ёзны крок на шляху да таго, каб вылечыць страх.

Дык што ж такое страх і чым ён небяспечны?

— Страх — гэта эмацыянальна афарбаваная кароткачасовая эмоцыя або адносна працяглы псіхічны стан, пачуццё ўнутранай напружанасці, якія спараджаюцца перажываннем рэальнай або чаканай небяспекі, — кажа Мая Аляксеева.

Пры страху ў арганізме адбываецца шэраг фізіялагічных змен і рэакцый. У работу ўключаецца гіпаталамус, гіпофіз і кара наднырачнікаў. У выніку актывацыі гіпаталамуса выпрацоўваецца корцікатрыпін. Ён у сваю чаргу ўключае нервовую сістэму і гіпофіз. Той запускае наднырачнікі і выпрацоўвае пралакцін. Наднырачнікі вылучаюць картызол. Разам з гэтым выпрацоўваецца адрэналін і норадрэналін. Вонкава і ўнутрана ўсё гэта праяўляецца ростам ціску, пачашчэннем пульсу і дыхання, раскрыццём бронх, «гусінай скурай», зніжэннем паступлення крыві да органаў стрававальнай і рэпрадуктыўнай сістэмы, пашырэннем зрэнак, выкідам у кроў глюкозы, хуткім згараннем тлушчаў, павышэннем кіслотнасці ў страўніку і зніжэннем выпрацоўкі ферментаў, адключэннем імуннай сістэмы.

Пры рэальнай небяспецы гэта дазваляе хутчэй думаць, лепш бачыць, біць мацней і бегчы хутчэй.

Але калі страх уяўны і пастаянны, то арганізму не ідзе на карысць усё, што адбываецца з ім у гэты момант. Менавіта таму на фоне страху развіваюцца псіхасаматычныя захворванні: парушэнні стула, ацёк бронхаў, задышка, боль у грудзях.

Такім чынам, узнікае замкнёнае кола. Напрыклад, вы баіцеся захварэць, але на фоне страху захворваеце. Акрамя таго чым часцей вы адчуваеце страх ці стрэс, тым горш вы ацэньваеце сітуацыю, што і выліваецца ў розныя хранічныя фобіі.

На ўзроўні псіхікі ўсё гэта суправаджаецца турботай, трывогай, паніжэннем настрою.

ШТО ПРЫНЯЦЬ, А З ЧЫМ ЗМАГАЦЦА?

Страхі дзеляць на тры групы: сацыяльныя, біялагічныя, экзістэнцыяльныя.

Да біялагічных адносяць тыя страхі, якія наўпрост звязаныя з пагрозай для жыцця чалавека. Самым папулярным страхам дадзенай групы з'яўляецца страх хваробы.

Усе сацыяльныя страхі выкліканы сітуацыямі, якія могуць падарваць сацыяльны статус, панізіць самаацэнку. Напрыклад, страх перад навакольнымі. У аснове гэтага страху ляжыць крытыка, прытым наша ўласная найперш.

— Для пераадолення гэтай праблемы пастарайцеся самі сябе не крытыкаваць, а больш хваліць. Чалавеку ўласціва праецыраваць свае недахопы ці праблемы на іншых, гэта значыць у людзях мы заўважаем і лаем тое, што не прымаем у сабе. І як бы гуляем на апярэджанне, пакуль гэта не заўважылі ў нас. Гэта значыць, мы баімся, што нашы недахопы — прыдзірлівасць, крыўдлівасць, помслівасць, канфліктнасць, ілжывасць, нядобрасумленнасць, нерашучасць — заўважаць. На гэтай жа падставе ўзнікае страх падацца смешным, трапіць пад злы настрой кагосьці. Для вырашэння гэтай праблемы неабходна навучыцца самому дэманстраваць тое, што вы хочаце бачыць у навакольных, — раіць псіхолаг.

Экзістэнцыяльныя страхі выклікаюцца разважаннямі над пытаннямі, якія закранаюць праблемы жыцця, а таксама смерці і самога існавання чалавека. Напрыклад, самым папулярным страхам дадзенай групы з'яўляецца страх смерці — сваёй ці блізкіх. Гэта самы неадназначны феномен. З аднаго боку, ён можа дасягаць такіх маштабаў, што чалавек зачыніцца ў чатырох сценах і будзе проста адмотваць адведзены тэрмін. Але з іншага боку, гэта нармальны страх, які прымушае нас глядзець па баках, калі мы пераходзім дарогу.

— Справіцца з ім можна толькі адным шляхам — прыняць. Усе людзі смяротныя. Няма сэнсу пераживаць смерць некалькі разоў у думках і азмрочваць сабе гэтым усё жыццё, — кажа Мая Аляксеева.

ЯК ПАЗБАВІЦЦА СТРАХАЎ?

Вось некалькі парад.

1. Для пазбаўлення ад страху першапачаткова неабходна яго прызнаць. Гэта самы сур'ёзны крок. Амаль у кожнага з нас ёсць нейкія асцярогі, але яны хаваюцца недзе ў глыбіні нашай свядомасці, часта незаўважаныя, непрызнаныя, паколькі мы ігнаруем іх і робім выгляд, што яны не існуюць. Але яны ёсць і ўплываюць на нас кожны дзень на працягу ўсяго нашага жыцця. Такім чынам, прызнайце вашы страхі.
2. Запішыце іх. Чаго вы баіцеся? Выкладзіце гэта на паперы. Запіс будзе азначаць прызнанне і пралье святло на вашы асцярогі. Калі вы выклалі іх на паперы, можаце зрабіць з імі што-небудзь, што вам па душы. Напрыклад, спаліць ці разарваць, сімвалізуючы знішчэнне, а можна павесіць на халадзільнік як напамін пра вашых ворагаў.
3. Адчуйце свой страх. Усвядомце, што вы не адзін такі, што ўсе мы адчуваем рознага роду асцярогі. Многія маюць тыя ж страхі, што і вы. Няма нічога няправільнага ў тым, каб адчуваць страх. Адчуйце свой страх максімальна поўна і глыбока. Гэта частка вас, але яна вамі не кіруе.
4. Спытайце сябе: што самае горшае, што можа здарыцца? Часта гэта не так страшна, як мы думаем спачатку. Вы баіцеся правалу на новай рабоце? Што будзе, калі такое здарыцца? Вы знойдзеце іншую работу. І будзеце жыць далей. Вы баіцеся, што вас адштурхне хтосьці супрацьлеглага полу? Вы знойдзеце кагосьці больш прыдатнага для вас. Вы баіцеся фінансавага краху? Вы скароціце вашы выдаткі, магчыма, папросіце сям'ю ці сяброў выручыць у гэты складаны для вас час. Вы знойдзеце спосаб зарабіць грошы і справіцеся.
5. Каб перамагчы страх, вы павінны проста рабіць тое, чаго баіцеся. Не трэба доўга думаць над гэтым — трэба дзейнічаць. Калі вы зробіце так, вы адчуеце ўзбуджальныя адчуванні.
6. Часцей смейцеся і ўсміхайцеся. Глядзіце камедыі ці гумарыстычныя шоу, чытайце анекдоты, шукайце ў інтэрнэце розныя смешныя гісторыі. Добра рабіць гэта ў кампаніі сяброў. Так вы зможаце ўдосталь пасмяяцца, зняць напружанне і на час забыцца аб сваіх страхах.
7. Будзьце ў сучаснасці. Страх пацярпець няўдачу (ці які-небудзь іншы) — гэта страх адносна будучыні. Мы захопленыя турботамі аб тым, што можа здарыцца. Адганіце ўсе думкі аб будучыні. Праганіце нават думкі аб мінулых памылках і няўдачах. Засяродзьцеся на сучаснасці. Рабіце прама зараз нешта, што можа пераадолець вашы страхі, і забудзьцеся аб тым, што можа здарыцца. Жывіце сучаснасцю. Калі вы ўсведамляеце, што думаеце пра мінулае ці будучыню, вяртайце сябе ў сучаснасць і факусіруйцеся на тым, што вы робіце прама зараз.
8. Невялікія крокі. Пераадоленне страхаў можа здавацца страшным і гнятлівым. Рабіце невялікія крокі. Нешта, што можаце зрабіць і ў чым вы ўпэўнены. Затым адчуйце прыемныя адчуванні і зрабіце іншы маленькі крок. Працягвайце ў тым жа духу.
9. Святкуйце кожны поспех, нават невялікія дасягненні. Выкарыстоўвайце гэта пачуццё поспеху для таго, каб рушыць наперад далей і зрабіць наступны крок.

Зразумела, што часта мы залежым ад абставін, але стаўленне да іх залежыць толькі ад нас. Каб не даць страху авалодаць намі і перайначыць наша жыццё, трэба перагледзець свае адносіны да гэтай натуральнай і малапрыемнай рэакцыі нашага арганізма, — рэзюмуе псіхолаг.

Была вайна

«УСЕ ЯК БЫЦЦАМ ВЫЖЫЛІ,

але ніхто не ведае, колькі страцілі сіл і свайго здароўя...»

З многімі (ды што там, амаль усімі) наведвальнікамі бібліятэкі ў нас цёплыя даверлівыя адносіны. Мы рады сустракаць нашых чытачоў, рады прапанаваць цікавую кнігу альбо часопіс, распытаць пра ўражанні і нават выслухаць. Марыя Рыгораўна Перашчук расказала аб тым, што давялося перажыць яе бабулі Софіі Сямёнаўне Навумік.

Так склалася, што яна, маладая і прыгожая, замуж выйшла за чалавека, які быў на 26 гадоў старэйшы за яе, у шлюбе нарадзіла чацвёра дзяцей — двух хлопчыкаў, Рыгора ды Івана, і дзвюх дзяўчынак — Марыю ды Надзейку.

Жыла сям'я так, як іншыя ў вёсцы: з мазаля, што называецца. Трымалі жывёлу, абраблялі зямлю, на балоце збіралі журавіны, у лесе — грыбы. Вельмі шмат працавалі. Да таго ж гаспадар Мікалай Дзям'янавіч Навумік быў мясцовым актывістам. Калі сталі стварацца калгасы, падаў прыклад іншым: напісаў заяву і гэтым учынкам, можна сказаць, увайшоў у гісторыю вялікай вёскі Хатынічы — як стваральнік мясцовай калектыўнай гаспадаркі, як старшыня сельскага Савета...

Займаючы гэтую пасаду, можна, як вядома, нажыць не толькі сяброў-аднадумцаў, але і ворагаў. Якраз тыя, калі пачалася вайна, данеслі немцам на актывіста.

На шчасце, Мікалай Дзям'янавіч паспеў тады збегчы — схавацца ў лесе. Малую Надзейку прытуліла суседка Пелагея Пічыц, а вось жонка яго з трыма дзецьмі і двума братамі трапіла ў палон да фашыстаў.

Хадзілі чуткі, што іх расстраляюць, і жанчына маліла Бога, каб выратаваў хоць бы дзяцей... Калі выводзілі на вуліцу, ногі, як расказвала, адмаўляліся ісці, вочы з-за слёз амаль нічога не бачылі. Хлопчыкі стараліся трымацца, як мужчыны, а вось Марыйка тулілася да матулі, шукаючы, чакаючы паратунку, а тая нічога не магла зрабіць...

Гэты жах крыху адступіў, калі стала вядома, што расстрэлу не будзе: сям'ю адпраўляюць у Германію. Софія Сямёнаўна здагадвалася, што нічога добрага іх не чакае і там, але ж яны пакуль заставаліся жывымі і разам.

...Прадчуванні не падманулі: сям'я апынулася ў адным з працоўных лагераў у горад Кіль. Як потым стала вядома, немцы трымалі там каля 5000 чалавек з розных рэспублік Савецкага Саюза, з Польшчы і ставіліся да іх горш, чым да скаціны. Да месца работы нявольнікі хадзілі часам за дзесяць кіламетраў і працавалі потым па дзесяць гадзін.

У самім лагеры будавалі новыя баракі і рамантавалі дарогі, расчышчалі завалы ў горадзе, нарыхтоўвалі дровы... А кармілі пры гэтым — абы не гінулі з голаду (каля 600 чалавек усё роўна памерла). Той, хто не працаваў або хварэў, ежу не атрымліваў наогул.

З такіх вось была Марыйка, дачка Софіі Сямёнаўны, якая выжыла (свет не без добрых людзей!) дзякуючы маладзенькай немцы. Тая, працуючы на кухні, падкормлівала дзяўчынку ўпотай.

...Пасля вызвалення Софія Сямёнаўна з дзецьмі дабралася дамоў у вёску Хатынічы. Ужо там даведалася, што яе муж з дачкой Надзеяй, пакуль не мінула небяспека, жыў у лесе ў зямлянцы.

Сям'я нарэшце ўз'ядналася, усе як быццам выжылі, але ж ніхто не ведае, колькі страцілі сіл і свайго здароўя, колькі нацярпеліся страху!

...У мірны час унучцы Софіі Сямёнаўны, таксама Марыйцы, давялося трапіць у горад Кіль, наведаць той лагер, убачыць баракі, дзе кожны куток быў напоўнены горам, паліты слязамі тысяч вязняў.

І яе любімай бабулі.

Што пра дзядулю, дык сёння ўжо праўнук яго Генадзь Аляксандравіч Перашчук працуе старшынёй Хатыніцкага сельскага Савета.

Таццяна Маляўка,
г. Ганцавічы.

Дзейныя асобы

«...ПЧОЛ НЕ ПАДМАНЕШ:

у нядобрых людзей яны проста не прыжываюцца»

Выбар прафесіі — справа не з лёгкіх: многія, пакуль знойдуць занятак даспадобы, чаго не паспытаюць, колькі гузоў не наб'юць. Івану Уладзіміравічу Макарэвічу з вёскі Каменны Барок з гэтым пашчасціла: і дзед яго, і бацька, і брат (а цяпер ужо і сын) захопленыя пчалярствам і пчоламі.

Калі нехта думае, што з імі ўсё проста — вуллі з рамкамі паставіў ды збірай на продаж мядок, то вельмі памыляецца. Пчолы патрабуюць да сябе разумнай увагі і клопату, цярпення і смеласці. За іх (не іначай!) яны гатовыя аддзякаваць гаспадару самым карысным і каштоўным прадуктам, бо на пчальніку і сапраўды хто дбае, той і мае.

У набытках Івана Уладзіміравіча — дыхтоўны дом з усімі выгодамі, прыгожай мэбляй, дыванамі, карцінамі (яшчэ і вышываными яго гаспадыняй)... З цудоўнай лазняй на падворку, з месцам для паляўнічых сабак і чатырох дзясяткаў курэй.

Вакол сялібы таксама рэдкая прыгажосць, ідэальныя чысціня і парадак. Нездарма на леташнім абласным конкурсе на найлепшы ветэранскі падворак сядзіба Макарэвічаў атрымала дыплом другой ступені...

Што яшчэ характэрна, уладальнікі амаль 200 пчаліных сем'яў не трымаюць на сваім прысядзібным участку ніводнага пчалінага дамка. «Па-першае, не хочацца ствараць дыскамфорт для сваіх суседзяў, — тлумачыць гаспадар, — а па-другое, вуллі ў нас выстаўлены на платформы. З імі мы пераязджаем на ўзлескі, на палі, засеяныя рапсам, фацэліяй, грэчкай... У мёдзе тады больш пажыўных рэчываў, лепшы смак».

Праўда, апошнім часам, як адзначае Іван Уладзіміравіч, нават на вось гэтакі, высакаякасны, прадукт не заўсёды знаходзяцца пакупнікі. Таму сям'я Макарэвічаў спецыялізуецца яшчэ і на развядзенні пчаліных матак, якіх потым прапануе пчалаводам-аматарам. Будучы адным з іх, я таксама скарысталася магчымасцю, набыла для сваёй невялічкай пасекі... А потым — яшчэ — і пажартавала, што Макарэвічы (асабліва старэйшы) маглі б прадаваць і веды-парады, бо калі ўзнікаюць праблемы з пчоламі, у коле сяброў па захапленні толькі і чуваць: «Трэба параіцца з Макарэвічам», «трэба спытаць...», «трэба папрасіць...»

Што важна, Іван Уладзіміравіч нікому не адмаўляе, бо ў сям'і яго бацькоў не было такой звычкі: усе разам — восем дзяцей — садзіліся есці за доўгі самаробны стол, усе разам, дружна ішлі працаваць і адзін аднаго выручаць, бо ў гаспадарцы, апроч пчол, каго толькі не было: каровы, коні, свінні, гусі, куры... Усё трэба было дагледзець, усіх пракарміць.

Пасля школы Іван трапіў на курсы пчаляроў у Смілавічы, па спецыяльнасці папрацаваў у адной з гаспадарак на Любаншчыне. Да сёння з гонарам і цеплынёй успамінае, як тады на іх пчальнік завітаў сам Пётр Міронавіч Машэраў...

Але ж стала хварэць маці, і ён вярнуўся дамоў, на радзіму. Тут ажаніўся са сваёй аднакласніцай, выгадаваў з ёй дваіх дзяцей.

— Мой Іван — цудоўны чалавек! Ва ўсіх адносінах, — са шчырай цеплынёй кажа пра мужа Галіна Мікалаеўна.

Не скупіцца на пахвалу і муж: прызнаецца, што яму вельмі пашчасціла ў жыцці, што жонка ў яго добрая.

...Не бракуе дабрыні і самому Івану Уладзіміравічу, што, відаць, заканамерна, бо пчол жа не падманеш: у нядобрых людзей яны проста не прыжываюцца.

Ніна Бурко,
Бярэзінскі раён.

Сёння над палубай жоўтыя ветразі —
Мой карабель адплывае ў верасень.
Што назаўжды пакідаю на беразе?
Росныя сцежкі ў жнівеньскім верасе,
Ў ліпеньскай ночцы — замовы, вяночкі,
Ў чэрвеньскіх ранках — расстанні ля ганку...
Ўсё, што за лета набыў, — пакідаю:
Мой карабель
з багажом не прымае.
Хай застаецца усё нажытое —
Толькі каб сябра быў побач са мною.

Чалавек — чалавеку

ПЕРШАЯ ЗАРПЛАТА

Людзі праўду кажуць: «Дзетак гадаваць — не курак пасклікаць». Ды яшчэ і без бацькі...
Тася засталася адна, калі сыну было дзесяць, а дачушцы — шэсць. Выпрабаванне, згадзіцеся, не з лёгкіх, але гэта жанчына несла свой крыж. Дзеці раслі.

Дзеці тым часам раслі, і яны ўжо разам з сынам вырашалі, што спачатку трэба скончыць каледж, атрымаць спецыяльнасць. Потым, калі прыйдзецца плаціць за вышэйшую адукацыю, да мамінай зарплаты прыплюсуецца сынава, ім будзе лягчэй.

Усё ішло па гэтым плане: Саша скончыў дзевяць класаў і падрыхтоўчыя курсы, паступіў у каледж, мог жыць у інтэрнаце, але ж вырашыў пасля заняткаў прыязджаць дамоў, дзе можна было сталавацца. Больш за тое — ён знайшоў сабе падпрацоўку: пасля заняткаў так старанна прыбіраў некалькі невялічкіх кабінетаў, што іх гаспадыні сталі пакідаць яму «чаявыя»: то гарбату з бутэрбродамі, то нават кавалак торта. А калі да іх яшчэ і зарплату...

Можна ўявіць, як гэты хлапчук радаваўся, атрымаўшы свае першыя грошы, як ён сам вырашыў абмяняць рублі на долары, як потым зайшоў у найбліжэйшае аддзяленне ашчаднага банка, як стаяў у чарзе, час ад часу гледзячы на гадзіннік, каб не спазніцца на аўтобус...

Нечыя нядобрыя вочы, мусіць, заўважылі яго хваляванне: двое маладых мужчын падышлі, прапанавалі абмяняць грошы без чаргі.

Утрох яны выйшлі на вуліцу — Саша аддаў свой заробак, тыя двое... у міг вока рванулі наўцёкі.

Што юнак адчуваў тады — таямніца за сямю пячаткамі, але ж па тэлефоне ён сказаў спакойна: «Мама, грошы я атрымаў, але іх у мяне ўжо няма».

Тася ўсё зразумела. Як мага спакайней спытала: «Сынок, а з табою ці ўсё ў парадку?.. Усё? Тады не хвалюйся за грошы! Яны — ты ж ведаеш — справа нажыўная. Прыязджай дадому...»

Паклаўшы слухаўку, жанчына горка заплакала, з яе вуснаў гатовыя былі сарвацца самыя страшныя праклёны. Але ж яна стрымалася: падышла да абразоў, папрасіла: «Божа, прабач гэтых людзей! Сам распарадзіся нашымі грашыма!»

На душы пасля таго стала спакайней, Тася прыгатавала вячэру. Калі прыехаў сын, яны моўчкі абмяняліся...

А далей усё пайшло па звычным раскладзе.

Саша, пасля каледжа, з чырвоным дыпломам скончыў ВНУ, займаецца любімай справай і заўсёды стараецца разумець і падтрымліваць іншых. Так як рабіла і робіць яго матуля.

Наталля Сівак,
в. Заполле, Чэрвеньскі раён.

Усмешачку!

ЁСЦЬ ЛОГІКА...

Апошнім часам у нашай сям'і было шмат непрыемнасцяў з хатнімі гадаванцамі.

Спачатку ў адчыненую фортку вылецеў папугай, і знайсці ды вярнуць яго, на жаль, не ўдалося (трохгадоваму сыну прыйшлося сказаць, што Кеша ў прабабулі ў вёсцы). Потым высветлілася, што ў дзіцяці алергія на поўсць, і туды ж «пераехала» падаранае нам кацяня, а ўрэшце — і памерлая рыбка.

Не так даўно за вячэрай мы гаварылі пра тое, што добра было б на тыдзень махнуць у вёску... Сын сказаў, што ён з намі не паедзе, бо адтуль ніхто не вяртаецца.

А. Няхай,
г. Магілёў.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607, УНП 191021390
Продавец	ОАО «МИЛКАВИТА», г. Гомель, ул. Бр. Лизюковых, 1. УНП 400068171
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5
Адрес ЭТП	www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов

